НОВЫЯ ФОРМЫ І ТЭРМІНЫ ВЫНІКОВЫХ ІСПЫТАЎ 4

ПЛЮСЫ НАВАГОДНЯГА ДАЖДЖУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

30 СНЕЖНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 257 (29879)

КАРАТКА

• Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь правяло дабрачынную акцыю ў доме для састарэлых і інвалідаў у Мінску.

• Беларусбанк знізіць стаўкі па крэдытах на нерухомую маёмасць з 1 студзеня.

• Акцыя «Цвярозы вадзіцель» пройдзе ў Мінскай вобласці з 30 снежня да 3 студзеня.

• Навагодні канцэрт у джазавым настроі пройдзе ў Мінскім планетарыі.

• Беларускія канькабежцы заваявалі дзевяць медалёў на чэмпіянаце Расіі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Шокавае ўздзеянне, якое, магчыма, было на першым этапе на асобныя галіны эканомікі, ужо прайшло. Эканоміка адаптавалася да сітуацыі. Нягледзячы на чаканае зніжэнне ВУП сёлета, ёсць і істотныя пазітыўныя зрухі. Дзякуючы прынятым на ўзроўні ўрада мерам удалося спыніць разгон інфляцыі, зараз мы назіраем дэфляцыйныя працэсы. Чакаю, што па выніках года мы ўтрымаемся ў калідоры 13 %. Ідзём прыкладна нараўне з Расіяй. У лістападзе налічаная сярэднямесячная заработная плата ў доларах дасягнула рэкорднага значэння. Мяркую, што па выніках снежня яна яшчэ прырасце. І спадзяюся, што прынамсі ў рэальным сектары эканомікі мы не дапусцім падзення зарплаты, а пенсіі толькі прырастуць. Відаць, будзе пэўнае невялікае зніжэнне па бюджэтніках, але адпаведныя рашэнні прыняты, каб у наступным годзе гэта кампенсаваць».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Калі дзіця ўсміхаецца — значыць, дзяржава існуе, грамадства здаровае»

Галоўная ёлка краіны з удзелам Прэзідэнта прайшла ў Палацы Рэспублікі

Хто з дзяцей не марыць пабываць на рэспубліканскай ёлцы, якая за некалькі дзён да Новага года традыцыйна праходзіць у Палацы Рэспублікі? У гэтых 2370 хлопчыкаў і дзяўчынак, якія прыехалі ў сталіцу з усіх рэгіёнаў краіны, з'явілася такая магчымасць. Своеасаблівы ўваходны білет на адну з галоўных навагодніх урачыстасцяў Беларусі яны заслужылі сваёй добрай вучобай, талентам і актыўным удзелам у грамадскім жыцці.

Акрамя пераможцаў міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў, на галоўную ёлку краіны былі запрошаны дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, тыя, хто выхоўваецца ў апякунскіх і прыёмных сем'ях. На ўрачыстасці прысутнічалі і выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў, дзеці з сем'яў бежанцаў, маленькія жыхары Данбаса, якія па запрашэнні Дабрачыннага фонду Аляксея Талая знаходзяцца на аздараўленні ў Віцебскай вобласці, дзеці асоб, што загінулі падчас выканання воінскага абавязку.

Па традыцыі са сцэны галоўнай залы краіны юных гасцей Палаца Рэспублікі вітаў кіраўнік дзяржавы. Перш чым звярнуцца да дзяцей, Аляксандр Лукашэнка ўручыў падарункі Дзеду Марозу і Снягурцы. Пры гэтым ён растлумачыў, што ўсе мы ў нейкай ступені застаёмся дзецьмі — кожны год нешта просім у Дзеда Мароза. Таму, на думку беларускага лідара, будзе правільным, калі і яны са Снягуркай атрымаюць падарункі.

Фота БелТА.

«Мае юныя сябры, я хачу перш за ўсё вас павіншаваць з надыходзячым Новым годам, святам чараўніцтва, весялосці і падарункаў, які вы пачынаеце сустракаць раней за ўсіх — як толькі запальваюцца ёлкі ў дзіцячых садках і школах, — звярнуўся да дзяцей Прэзідэнт Беларусі. — Я заўсёды кажу, што любая краіна моцная традыцыямі. Калі мы гаворым: краіна суверэнная і незалежная, значыць, павінны быць свае традыцыі — спрадвечныя, беларускія».

Беларускі лідар адзначыў, што Новы год — гэта свята, якое кожнага дарослага — кожнага — падахвочвае стаць чараўніком. «Не толькі Дзеда Мароза, усіх нас, — удакладніў ён. — А што робяць чараўнікі? Выконваюць жаданні».

Прэзідэнт прыгадаў яшчэ адну традыцыю, якая зарадзілася ў суверэннай, незалежнай Беларусі, — акцыю «Нашы дзеці». Па яго словах, яна існуе многія гады і ўжо ўкаранілася ў свядомасці нашага народа. «У гэтыя святочныя дні ўсе дарослыя — прадпрымальнікі, кіраўнікі прадпрыемстваў, дэпутаты, дзяржслужачыя — ідуць у дзіцячыя дамы, інтэрнаты, школы, дамы сямейнага тыпу і радуюць нашых дзетак і ўсіх, хто там жыве, навагоднімі падарункамі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Гэта таксама стала добрай традыцыяй, і я мяркую, што гэтую традыцыю нельга загубіць. Яе трэба працягнуць да старога Новага года».

СТАР. 2

Год гістарычнай памяці: рэгіёны

НАРОДНЫЯ ПРАЕКТЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Вывучалі, успаміналі, даследавалі, адкрывалі... Рух і жыццёвы рытм падзей адыходзячага Года гістарычнай памяці натхняе ўсіх разам і кожнага асабіста «зазямліцца», запаволіцца, асэнсаваць тое галоўнае, што неабходна цаніць і захаваць у сваім сэрцы і ў краіне ў цэлым. Чым запомніцца Год гістарычнай памяці жыхарам Гомельшчыны? Аб гэтым і не толькі — інтэрв'ю са старшынёй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Івана КРУПКО.

СТАР. 4

Рыштаванні Бацькаўшчыны

РАМАНТЫЧНЫ КАРОЛЬ БАЛЮ

У Косаве ўрачыста адкрылі палацава-паркавы комплекс

Фінал года на Брэстчыне вызначыўся, у тым ліку, і надзвычай прыгожым, відовішчным мерапрыемствам — урачыстым адкрыццём унікальнага помніка архітэктуры XIX стагоддзя — Косаўскага палацава-паркавага комплексу. Аб'ект канчаткова ўведзены ў эксплуатацыю пасля 14 гадоў работы па аднаўленні, рэканструкцыя пачалася ў 2008 годзе.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

СТАР. 3

«Калі дзіця ўсміхаецца — значыць, дзяржава існуе, грамадства здаровае»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што важна не забыць і пра пажылых людзей, якія сёння адзінокія. «Есць яшчэ і такія, пра якіх забыліся дзеці, і часам дзеці не бедныя, — канстатаваў ён. — Усе мы маладымі не будзем. Старых не трэба забываць». Кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванне, што акцыя «Нашы дзеці» працягнецца. Прычым увага павінна быць скіравана не толькі на дзяцей, а і на пажылых людзей, якім таксама патрэбна падарыць падарункі і павіншаваць з Новым годам і Нараджэннем Хрыстовым.

«Мы вельмі хочам, каб усе падрыхтаваныя сюрпрызы і падарункі вам спадабаліся, — звярнуўся да дзяцей Прэзідэнт. — Для нас гэта вельмі важна. А самі жадаем толькі аднаго — бачыць вашы ўсмешкі і ведаць, што вы жывяце ў міры і бяспецы. Калі дзіця ўсміхаецца — значыць, дзяржава існуе, грамадства здаровае. І, вядома, у нас баліць сэрца за мільёны іншых дзяцей. Дзяцей, якія загадваюць пад Новы год не новую цацку або пэўны гаджэт, як гэта прынята цяпер, як вы робіце, а трэба памятаць аб тых дзецях, якія просяць міру, просяць паесці, просяць, каб было цёпла ў доме. Хоць гэта элементарныя рэчы, якія проста абавязаны быць у жыцці кожнага чалавека, асабліва дзіцяці. Шмат дзяцей, якія хочуць паесці і спакойна жыць, каб на іх зямлі быў мір. Аб гэтых людзях, аб гэтых дзецях мы павінны памятаць заўсёды. Калі будзем памятаць, гэтая бяда ніколі не прыйдзе на нашу зямлю».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што, на шчасце, у маленькіх беларусаў іншыя мары — дзіцячыя. «Няхай яны заўсёды будуць такімі, і нягай гэтыя мары абавязкова здзяйсняюцца, — падкрэсліў ён. — Гэта і ёсць чараўніцтва, якое ўсе так чакаюць пад Новы год. Ад усяго сэрца яшчэ раз віншую вас, маленькіх і ўжо дарослых, будучыню нашай Беларусі, вашых педагогаў, выхавацеляў, настаўнікаў, вашых бацькоў з Новым годам! Жадаю вам выдатнага настрою, моцнага здароўя і, самае галоўнае, поспеху ў вучобе. Вучоба для вас — самая галоўная задача на гэтым этапе вашага жыцця».

Затым Прэзідэнт Беларусі саступіў сцэну яе гаспадарам — Дзеду Марозу і Снягурцы. Дзеці пагрузіліся ў чароўнае дзейства — навагоднюю казку, галоўным героем якой стаў сімвал нашай Беларусі — зубр.

Вераніка КАНЮТА.

❍ У тэму

ПАБЫВАЦЬ НА ЁЛЦЫ — НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК

Да пачатку мерапрыемства, якое чакала юных беларусаў і не толькі іх, мы пазнаёміліся з удзельнікамі рэспубліканскай ёлкі. Для вучаніцы 8 класа сярэдняй школы г. Мінска № 209 Ганны Івановай навагодняя ўрачыстасць такога ўзроўню стала падарункам да самага любімага свята. Дзяўчынка прызнаецца: вельмі шчаслівая, што апынулася тут. Безумоўна, выпадковых дзяцей на рэспубліканскай ёлцы не бывае. Ганна — капітан школьнай каманды, якая сёлета заняла першае месца ў гарадскім этапе спартыўна-патрыятычнай гульні «Зарніца». А вось яе сяброўка, Соф'я Грышына, таксама вучаніца згаданай школы, на Прэзідэнцкай ёлцы ўжо чацвёрты раз. Папярэднія разы яна трапляла сюды за дасягненні ў мастацкай гімнастыцы, сёлета — за паспяховы ўдзел у той жа «Зарніцы». Дзяўчаты лічаць, што пабываць на такой урачыстасці можа кожны школьнік: для гэтага дастаткова быць старанным і актыўным.

Анжаліка Кобрын прыехала на рэспубліканскую ёлку з Клецка. Прызнаецца, што такога прыгожага сімвала свята дагэтуль ніколі не бачыла. Дзяўчына — адна з актывістак сярэдняй школы № 1. Яна не толькі ўдзельнічае ў культурных і спартыўных мерапрыемствах сваёй школы, а і дапамагае пажылым людзям, інвалідам — Анжаліка яшчэ і валанцёр «Школы міру». Дабрачыннасцю школьніца займаецца не па загадзе, а па закліку сэрца.

Ілья Супрун і Яўген Дэйка, школьнікі са Слоніма, не маглі схаваць эмоцый — пабываць на галоўнай ёлцы краіны было іх марай. Жэня заняў першае месца на раённым конкурсе «Дзеці новага пакалення», Ілья таксама паказаў добры вынік на гэтым конкурсе.

Дзеля шчасця кожнага дзіцяці ў краіне

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава наведала Дзіцячы гарадок Ленінскага раёна сталіцы. Яна павіншавала дзяцей і педагогаў з надыходзячымі святамі, а таксама ўручыла салодкія падарункі і сертыфікат на набыццё спецыяльнага абсталявання для ўстановы. Гэта далёка не першая сустрэча Наталлі Качанавай з выхаванцамі дзіцячага гарадка: летась Старшыня Савета Рэспублікі ўжо наведвала ўстанову падчас навагодніх свят, а пасля некаторыя з дзетак былі запрошаны ў Савет Рэспублікі.

— Я шчыра віншую вас з Новым годам, — звярнулася да дзяцей Наталля Качанава. — Вельмі хачу, каб вашы мары спраўдзіліся. Жадаю, каб вы былі здаровыя, моцныя, сапраўды любілі сваю краіну. Так павялося, што з некаторымі з вас мы пазнаёміліся летась — вы былі нашымі гасцямі ў Савеце Рэспублікі. Мы прыехалі да вас ізноў, і я ўпэўненая, што наша сяброўства будзе працягвацца. Памятаю, што вы прасілі, каб я перадала вашы словы падзякі Прэзідэнту нашай краіны. Я гэта выканала і перадала Аляксандру Рыгоравічу вашы пажаданні і распавяла аб тым, якія вы добрыя дзеці. А цяпер я перадаю вам словы ад Прэзідэнта: ён пажадаў вам усяго самага найлепшага.

Звяртаючыся да старшакласнікаў, Старшыня Савета Рэспублікі пажадала ім набыць менавіта тую спецыяльнасць, аб якой мараць, а маленькім дзеткам — добрай вучобы і насычаных канікул:

— У гэты святочны дзень я таксама хацела б павіншаваць нашых педагогаў: нізкі паклон за вашу працу: вы аддаяце часцінку цеплыні нашым дзеткам, якіх мы бязмерна любім.

Наталля Качанава таксама адзначыла, што для яе навагоднія сустрэчы з дзецьмі — шчасце:

— Яны такія маленькія, але ўжо патрыёты сваёй краіны: заўсёды гавораць аб тым, як любяць сваю родную Беларусь, ведаюць сваю гісторыю — я ў гэтым пераканалася неаднойчы. Таму дай Бог ім шчасця і здароўя, а мы заўсёды будзем разам з імі. І калі кожны будзе разумець, што ад нас залежыць шчасце кожнага дзіцяці ў краіне, гэта будзе выдатна, — падсумавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Выхаванцы дзіцячага гарадка выступілі з музычнымі нумарамі, павадзілі карагод з гасцямі свята, а таксама ад імя дзяцей Ленінскага раёна падарылі Старшыні Савета Рэспублікі альбом і малюнак Лошыцкай сядзібы. Наталля Качанава адзначыла, што ўсе падарункі будуць захоўвацца ў музеі Савета Рэспублікі.

Арына КАРПОВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Цэнтрабанкі свету пачалі скупляць золата рэкордным з 1967 года тэмпамі

Цэнтрабанкі свету з пачатку 2022 года закупілі 673 тоны золата, 400 тон з якіх — у ліпені—верасні. Тэмпы набыцця цэнтрабанкамі «жоўтага металу» сталі рэкордным з 1967 года, паведамляе газета Finacial Times.

Паводле даных газеты, найбольшыя аб'ёмы закупляюць ЦБ Расіі і Кітая. Мэта рэгулятараў — дывэрсіфікацыя залатавалютных рэзерваў і дыстанцыяванне ад долара, гаворыцца ў матэрыяле.

Як раней паведамлялася, Расія па выніках дзевяці месяцаў 2022 года паднялася на чацвёртае месца па аб'ёме золатавалютных рэзерваў сярод найбуйнейшых суверэнных эканомік. РФ, па звестках на 1 верасня 2022 года, валодала (з улікам замарожаных заходнімі краінамі актываў) $540 млрд долараў. Па даных ЦБ, аб'ём золатавалютных рэзерваў Расіі з 9 па 16 снежня вырас на $ 5,2 млрд, або 0,9%. Паводле звестак на 16 снежня, ён дасягнуў $581,7 млрд.

На першым месцы гэтага рэйтынгу знаходзіцца Кітай, які валодае на канец верасня $3,193 трлн. Другі радок займае Японія — $1,238 трлн. Трэцяй стала Швейцарыя з актывамі $892 млрд.

Global Times: «мірны саміт» на пляцоўцы ААН без РФ не дапаможа завяршэнню баёў ва Украіне

Так званы мірны саміт на пляцоўцы ААН, прапанаваны ўкраінскімі ўладамі, без удзелу РФ не дазволіць завяршыць узброены канфлікт ва Украіне. Такое меркаванне выказалі аўтары кітайскай газеты Global Times, паведамляе ТАСС.

«Мірны саміт» без Расіі не зможа аказаць садзейнічанне спыненню агню, — гаворыцца ў рэдакцыйным артыкуле выдання. — На сустрэчы, якая нацэлена на аднаўленне міру паміж бакамі, уцягнутымі ў ваенны канфлікт, павінен прысутнічаць кожны з іх: ЗША гэта, Расія ці Украіна».

Як мяркуюць аўтары, прапанаваны Кіевам саміт страчвае сэнс без удзелу Масквы. «Гэта мерапрыемства ў выніку ператворыцца ў міжнародны публічны судовы разбор, накіраваны супраць Расіі», — удакладняюць яны.

У артыкуле адзначаецца, што «мірны саміт» стане прычынай, якая дазволіць Захаду зрабіць дадатковыя крокі, накіраваныя на ізаляцыю РФ. «Мір паміж Расіяй і Украінай павінен быць дасягнуты шляхам перагавораў пры падтрымцы міжнароднай супольнасці, — падкрэсліваюць аўтары. — Мяркуючы па існуючай сітуацыі, Масква і Кіеў не дасягнулі кансэнсусу па мірным пытанні, што робіць размытай надзею на спыненне агню».

Fox News: армія ЗША недабрала 25 % ваеннаслужачых з-за праблем з псіхікай сярод моладзі

У 2022 годзе армія Злучаных Штатаў не дасягнула мэты па навабранцах з-за праблем у моладзі з атлусценнем, адсутнасцю атэстатаў аб заканчэнні сярэдняй школы і псіхічным здароўем, паведамляе Fox News.

«Крызіс наспяваў гадамі», — піша аўтар артыкула.

У амерыканцаў знікла цікавасць да ваеннай службы, бо грамадства аддзялілася ад арміі. Грамадзяне паняволі ідуць і ў добраахвотніцкія сілы (AVF), усё менш навабранцаў з ваенных сем'яў уступаюць у рады узброеных сіл, сцвярджае аўтар.

Раней сенатар Том Котан, які прадстаўляе Рэспубліканскую партыю, заявіў, што сацыяльныя эксперыменты ў амерыканскай арміі могуць прывесці да фатальных наступстваў. Паводле яго слоў, неад'емнай часткай ваеннай падрыхтоўкі амерыканскіх ваенных сталі «расавыя, гендарныя і супярэчлівыя палітычныя вучэнні».

Падрабязнасці

Украінская ракета была знішчана пасля перасячэння дзяржграніцы Беларусі

Абломкі ўпалі літаральна за 60 метраў ад ускрайку аграгарадка

Украінская ракета была знішчана адразу пасля перасячэння дзяржаўнай граніцы Беларусі, паведамілі ў Міністэрстве абароны.

Камандзір зенітнага ракетнага дывізіёна распавёў, што ў ходзе выканання задач баявога дзяжурства ўчора каля 10.00 сродкамі радыёлакацыйнай разведкі дывізіёна была знойдзена паветраная цэль, якая рухалася з боку Украіны. У выніку дакладных і зладжаных дзеянняў баявога разліку яна была ўзята на суправаджэнне. Пасля перасячэння дзяржаўнай граніцы і ўваходу ў паветраную прастору цэль была знішчана ў раёне аграгарадка Горбаха Іванаўскага раёна.

Абломкі ракеты ўпалі літаральна за 60 метраў ад крайняга дома ў населеным пункце, паведаміў карэспандэнт БелТА з месца падзей. Аб здарэнні неадкладна быў праінфармаваны кіраўнік дзяржавы. У ходзе праверачных мерапрыемстваў папярэдне ўстаноўлена, што абломкі належаць зенітнай кіраванай ракеце С-300, выпушчанай з тэрыторыі Украіны. Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі сфарміравана група спецыялістаў з ліку супрацоўнікаў Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і Міністэрства абароны, якія працуюць на месцы здарэння.

Следчы камітэт Беларусі ўзяў для даследавання аб'екты з месца падзення ўкраінскай ракеты, паведаміла БелТА са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка ведамства Сяргея Кабаковіча. Падрабязна фіксуецца следавая карціна, адбіраюцца аб'екты, якія маюць значэнне для следства і наступнага правядзення экспертных даследаванняў.

У МЗС Беларусі выклікалі пасла Украіны Ігара Кізіма, яму заявілі рашучы пратэст у сувязі з інцыдэнтам з ракетай. Аб гэтым заявіў журналістам прэс-сакратар беларускага знешнепалітычнага ведамства Анатоль Глаз. «Гэта вельмі сур'ёзны інцыдэнт. І беларускі бок максімальна сур'ёзна да гэтага пытання ставіцца. У сувязі з гэтым у МЗС Беларусі быў выкліканы пасол Украіны Ігар Кізім, якому быў заяўлены рашучы пратэст. Мы запатрабавалі, каб украінскі бок правёў дакладнае расследаванне ўсіх абставін пуску названай ракеты, прыцягнуў да адказнасці вінаватых і прыняў вычарпальныя меры, каб не дапусціць паўтарэння ў будучыні падобных інцыдэнтаў, якія могуць прывесці да катастрафічных наступстваў для ўсіх», — адзначыў Анатоль Глаз.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 31 снежня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Віктаравіч ДУРНОЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васільевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

А **5 студзеня** на базе КУП «Жыллёва-камунальная гаспадарка Першамайскага раёна г. Мінска» (вул. Кедышкі, 27) у кабінеце № 209 (2-і паверх) адбудзецца выязны асабісты прыём **старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміра Яўгенавіча КУХАРАВА**.

Выязны асабісты прыём будзе праводзіцца згодна з папярэднім запісам з 17.00.

Папярэдні запіс на выязны асабісты прыём ажыццяўляецца ў перыяд з 03.01.2023 да 04.01.2023 з 8.45 да 13.00 і з 14.00 да 17.00:

па тэлефоне 357 77 47 або ў кабінеце № 420 (зав. К. Чорнага, 5);

па тэлефоне 218 01 39 або ў кабінеце № 137 (прасп. Незалежнасці, 8).

Трэба ведаць

Урад змяніў правілы школьнага харчавання

У краіне мяняюцца правілы школьнага харчавання. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 27 снежня 2022 года № 917, афіцыйна апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Згодна з дакументам, пры разліку платы за харчаванне цяпер не будуць улічвацца дні, калі вучні не атрымлівалі харчаванне па прычыне іх адсутнасці ва ўстанове адукацыі. Законныя прадстаўнікі абавязаны напярэдадні пісьмова або вусна паведаміць педагагічным работнікам установы адукацыі аб адсутнасці вучня.

Таксама плата за харчаванне вучняў будзе ажыццяўляцца законнымі прадстаўнікамі штомесяц не пазней за 25-е чысло бягучага месяца на бягучыя (разліковыя) банкаўскія рахункі па ўліку бюджэтных і іншых дзяржаўных сродкаў арганізацый, што вызначаюцца заснавальнікамі ўстаноў адукацыі і (або) аблвыканкамамі (Мінскім гарвыканкамам) у адпаведнасці з бюджэтным заканадаўствам. Запазычанасць па плаце за харчаванне вучняў спаганяецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

Надвор'е

Ці будзе зімовая казка на святы?

Дажджы, моцны вецер і да плюс 13 градусаў прагназуюцца ў Беларусі з 30 снежня да 4 студзеня, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

«Атлантычнае цяпло не дае шанцаў на зімовую марозную казку ў навагоднія святы. 2022 год скончыцца цёплым, але ветраным і сырым надвор'ем», — пракаментавалі ў Белгідрамецэ.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны — ападкі (дождж, мокры снег). Уначы і раніцай месцамі слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, а днём — ад плюс 1 да плюс 7 градусаў.

У суботу ноччу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег), днём на большай частцы тэрыторыі краіны дажджы, па паўночным усходзе — з мокрым снегам. У асобных раёнах будуць утварацца слабыя туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Днём месцамі па поўначы адбудзецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ноччу складзе мінус 3 — плюс 3 градусы, днём — плюс 1—7 градусаў. Па паўднёвым захадзе чакаецца да плюс 9 градусаў.

«У нядзелю ў нашу краіну пачне паступаць яшчэ больш цёплае паветра з паўднёвага захаду Еўропы, і тэмпературны фон па краіне будзе на 7—10 градусаў вышэйшы за кліматычную норму. Пры гэтым камфортным такое надвор'е наўрад ці назавеш — ападкі будуць суправаджацца парывістым ветрам. Уначы месцамі па краіне, а днём 1 студзеня на большай частцы тэрыторыі вецер будзе ўзмацняцца да моцнага парывістага», — расказалі сіноптыкі.

У нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У асобных раёнах прагназуецца слабы туман. Уначы месцамі, а днём у многіх раёнах — узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Начная тэмпература паветра складзе плюс 1—8 градусаў, а дзённая будзе вагацца ад плюс 4 градусаў па ўсходзе да плюс 13 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

У панядзелак захаваецца цёплае надвор'е. Пераважна па паўночнай частцы краіны пройдуць дажджы. У асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да плюс 1—7 градусаў, а днём складзе плюс 3—10 градусаў.

У аўторак месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 1 да плюс 6 градусаў, а па поўдні прагназуецца да плюс 8 градусаў.

Па папярэдніх прагнозах сіноптыкаў, у сярэдзіне наступнага тыдня ў нашу краіну пачне паступаць няўстойлівая і больш прахалодная паветраная маса са Скандынавіі, таму тэмпературны фон панізіцца.

У сераду месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег, дождж). У асобных раёнах — слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад плюс 3 да 4 градусаў вышэй за нуль.

РАМАНТЫЧНЫ КАРОЛЬ БАЛЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На тэрыторыі цяперашняга Іванцэвіцкага раёна палац быў пабудаваны ў сярэдзіне XIX стагоддзя буйным прамыслоўцам і аматарам мастацтваў Вандалінам Пуслоўскім. І калі Ружанскі палац часта памылкова называюць замкам, бо ён асацыіруецца з інтрыгамі, скляпеннямі, жорсткасцю нораваў у прыгонным тэатры, то звесткі пра Косаўскі палац наскрозь прасякнуты рамантызмам. Як у той песні: «Балы, красавицы, лакеи, юнкера».

Рэзідэнцыя, пабудаваная ў стылі англійскай неаготыкі, нагадвала рамантычна-таямнічы замак. І рамантызм, і велічнасць, і таямнічасць стваралі найперш вежы, крыху падобныя на старажытныя замкавыя. Кожная з дванаццаці веж сімвалізавала месяц года. Гэтыя вежы сталі галоўным архітэктурным элементам палаца, яго «каньком». Яны маюць зубчастае завяршэнне, што дадае адчуванне старадаўнасці і некаторай непрыступнасці. Апошняму спрыялі таксама аконныя і дзвярныя праёмы стрэльчатых абрысаў накшталт байніц. Вялізныя гатычныя праёмы ў сценах галерэй наводзяць на думку аб асаблівай таемнасці, загадкавасці і велічы пабудовы. Засталося нямала сведчанняў, якія шыкоўныя і незвычайныя балі праходзілі ў Косаве. Упрыгажэннем адной з залаў служыў вялікі акварыум з рыбкамі, а ў зімовым садзе на прывязі сядзеў сапраўдны леў. Кожная зала мела свой асаблівы інтэр'ер, свой колер, за які і атрымала назву. Былі тут Белая, Чорная, Руковая, Сярэбраная залы. Знакамітая бібліятэка Пуслоўскіх саступала хіба толькі суседняй сапегаўскай у Ружанах. Некалькі тысяч тамоў і рукапісаў налічвала кнігасховішча палаца.

А пра незвычайныя бэзавыя кампазіцыі Косаўскага палаца да гэтай пары ўспамінаюць тутэйшыя жыхары. Калі зацвітаў бэз, скампанаваны па колерах, то воку адкрывалася незвычайнай прыгажосці карціна. Кусты цвілі яшчэ некалькі гадоў пасля пажару 1944 года, пакуль канчаткова не выродзіліся і не загінулі пад наступленнем лесу. А разбурэнне помніка архітэктуры пачалося ў пачатку мінулага стагоддзя. У гады Першай сусветнай вайны палац быў захоплены немцамі, тады ён атрымаў пашкоджанні, шматлікія каштоўнасці былі вывезены за мяжу. За польскім часам тут знаходзілася сельскагаспадарчая школа, у якой навучалі пчаляроў. Падчас апошняй вайны немцы размясцілі ў палацавым комплексе камендатуру, а побач знаходзілася гета. У 1944 годзе будынак падпалілі партызаны, пажар бушаваў сем дзён. Пасля пажару засталіся толькі сцены. Прырода і час рабілі сваю справу — палац

Фота Валеры КАРАЎ.

разбураўся, у наваколлі пашырылася запусценне.

Пра рэстаўрацыю гаварылі даўно, а распачаць яе ўдалося толькі ў маі 2008 года ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы. З той пары на аб'ект накіравана амаль 35 мільёнаў рублёў з рэспубліканскага, абласнога і раённага бюджэтаў. Першы этап рэканструкцыі завяршылі ў лістападзе 2017 года.

Тады быў адноўлены будынак палаца з 12 вежамі, а таксама цокальны і першы паверхі, рэстаўрыравалі некалькі залаў. Паявілася часовая музейна-выставачная экспазіцыя з пяці залаў. У сярэдзіне 2019 года створана дзяржаўная ўстанова культуры «Косаўскі палацава-паркавы комплекс», у склад якой увайшла таксама музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі. У 2020 годзе перад уваходам паявіўся фантан, які ўпрыгожылі дэкаратыўныя элементы.

Раней для наведвальнікаў былі адкрытыя цокальны і першы, а цяпер яшчэ і другі паверх. Цокальны расказвае гісторыю палаца з 1838 года да нашых дзён. На першым дэманструюцца інтэр'еры былых часоў. Новыя Ізумрудная і Рубінавая залы — сэрца палаца, яны здзіўляюць веліччу і прыгажосцю. У Ізумруднай зале з часам паявіцца экспазіцыя пра захапленне графіні Пуслоўскай флорай і фаўнай. У Рубінавай зале — партрэты знакамітых беларусаў розных эпох. У наступным годзе плануецца завяршыць рэканструкцыю парку і воднай сістэмы палаца — яшчэ адной яго адметнасці.

На ўрачыстае падвядзенне вынікаў вялікай работы па рэстаўрацыі сабралася шмат гасцей. «За 14 гадоў рукамі нашых архітэктараў, рэстаўратараў, інжынераў, рабочых пабудовы прыведзены ў цудоўны выгляд, — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Сёння гэты комплекс на праву становіцца адной з візітовак Брэстчыны».

Са знамянальнай падзеяй павіншаваў прысутных міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч. Дырэктар філіяла «Брэстрэстаўрацыя» Аляксандр Кушнярук па традыцыі ўручыў сімвалічны ключ гаспадарам. Дырэктар комплексу Ірына Семянюк правяла экскурсію па залах палаца.

І які ж палац без балю! У Белай зале, як і раней, загучалі вальсы і паланэзы. А прыгожыя юнакі і дзяўчаты, удзельнікі абласнога маладзёжнага балю, кружылі ў танцах. Запрасілі самых таленавітых — пераможцаў алімпіяд і конкурсаў, спартыўных спаборніцтваў, аўтараў інавацыйных праектаў. Імі сталі студэнты чатырох ВНУ рэгіёна, вучні абласнога ліцэя імя П. М. Машэрава, абласнога кадэцкага вучылішча, школ раёнаў вобласці. Да свята юныя дамы і кавалеры рыхтаваліся некалькі тыдняў, таму вальсы, полькі, паўночная кадрыля атрымаліся ў іх выкананні бездакорна. А ў гэтых сценах, якія памятаюць шыкоўныя вячэрнія мерапрыемствы, яны выглядалі надзвычай арганічна.

...На Косаўскі палац варта паглядзець здалёк. Асабліва ў ясны, сонечны дзень ён нагадвае замак са старой казкі ці з фільма пра даўніну. Усё-ткі нездарма яго называюць апошняй данінай рамантызму ў нашым краі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НАРОДНЫЯ ПРАЕКТЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Іван Іванавіч, не магу не згадаць словы вашага сёлетняга выступлення на мітынгу ў Гомелі да Дня Незалежнасці Беларусі і 78-й гадавіны вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: «Мы ствараем, каб захаваць незалежную Радзіму, яе аўтэнтычнасць — з неглюбскімі паясамі і тканымі ручнікамі, народнымі абрадамі і ўнікальнымі традыцыямі. Захаваць сям'ю і радаснае дзяцінства, дзе ва ўсіх дачок і сыночкаў ёсць мамы і таты, бабулі і дзядулі. Дзе ў кожнага свая малая радзіма са сцяжынкай да святой крыніцы, вада якой забірае боль, умацоўвае памяць і дае сілы. Сілы не схіліць галаву перад тымі, каму нашы продкі 80 гадоў таму ўказалі іх месца ў сусветнай гісторыі, сілы з горда паднятай галавой супрацьстаяць любым спробам наваяўленых агрэсараў. Мы зробім гэта разам, па запавеце продкаў, па поклічы сэрца». Падаецца, што гэтыя радкі адлюстроўваюць галоўны пасыл Года гістарычнай памяці. Што ён значыць для вас асабіста?

— Перакананы, што Год гістарычнай памяці — перыяд небывалага ўсёахопнага ўздыму патрыятычнага духу. Для мяне асабіста гістарычная памяць пачынаецца з успамінаў дзядулі і родных, якія перажылі акупацыю. Нездарма старэйшае пакаленне, якое зведала ўсе нягоды ваеннага ліхалецця, да гэтага часу паўтарае: «Толькі б не было вайны». Тыя страшныя гісторыі на ўсё жыццё пакінулі ў маёй душы глыбокія раны, якія з новай сілай прымушаюць пакутаваць ад любых спроб псеўдагісторыкаў сумнявацца ў гераічным подзвігу савецкага народа, ад цынічных спекуляцый вакол Вялікай Перамогі. Я ўпэўнены, што мы ўжо нараджаемся з маральным генетычным барометрам, які дапамагае нам супрацьстаяць усім бессаромным спробам фальсіфікаваць нашу гісторыю. Дапамагае захаваць і перадаць нашым нашчадкам праўду і толькі праўду. Бо без памяці аб мінулым немагчыма будаваць паспяховую будучыню.

Перакананы, што Год гістарычнай памяці заматываваў многіх больш дэталёва вывучыць біяграфіі членаў сваіх сем'яў, а праз іх і гісторыю сваёй краіны, звярнуцца ў архівы з жаданнем як мага больш даведацца пра ваеннае ліхалецце і пасляваенныя гады аднаўлення. Гісторыя, на якую мы з асаблівай цікавасцю глядзім у Год гістарычнай памяці, адсылае зноў і зноў вяртацца да вывучэння дакументаў, архіваў, успамінаў. У нас расце запатрабаванне здабыць новыя веды, выразныя аргументы, гістарычныя факты, каб упэўнена перадаваць дзецям і ўнукам гістарычную праўду. На сучасным этапе гэта архіважна.

— Сімвалам Года гістарычнай памяці на Гомельшчыне стала адкрыццё пасля маштабнай рэканструкцыі ваенна-гістарычнага комплексу «Партызанская крынічка» на месцы базіравання ў гады Вялікай Айчыннай вайны партызанскага атрада «Бальшавік». Іван Іванавіч, вы асабіста бралі ўдзел у суботніках яшчэ на стадыі падрыхтоўкі адкрыцця мемарыяла. Ужо тады «Партызанскую крынічку» па праву назвалі народным патрыятычным праектам рэгіёна.

— Сапраўды, дапамога ва ўзвядзенні і ўдзел у добраўпарадкаванні гэтага месца памяці — заслуга ўсіх жыхароў вобласці. Падчас суботнікаў тэрыторыю ў лесе, дзе знаходзіцца комплекс, добраўпарадкоўвала адначасова да паўтары тысячы чалавек. Між тым агульнанацыянальнае значэнне гэтага месца памяці асабліва відавочнае, калі «Партызанскаю крынічку» практычна штодня наведваюць з экскурсіямі школьнікі і педагогі, калектывы прадпрыемстваў і члены ветэранскіх арганізацыі з самых розных куткоў Беларусі. І гэта вельмі важна, бо адноўлены ваенна-гістарычны комплекс у гонар усіх партызанскіх злучэнняў Гомельшчыны — агульнае месца пакланення гераізму, адзін з цэнтраў ваенна-патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Нагадаю, што самую шчырую ўдзячнасць за праведзеную рэканструкцыю, а фактычна ўзвядзенне новага гісторыка-ваеннага мемарыяла «Партызанская крынічка», выказалі жыхары не толькі нашай краіны, але і Расійскай Федэрацыі. На Браншчыне вельмі ўдзячныя за захаванне памяці аб іх земляку — Герою Савецкага Саюза Емяльяне Барыкіне. Увогуле, самыя шчырыя словы падзякі за беражлівае захоўванне гістарычнай памяці аб героях вайны брацкі народ суседняй краіны адрасаваў нашаму Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку і ўсяму беларускаму народу.

— У Год гістарычнай памяці асабліва востра адчуваецца імкненне беларусаў не дапусціць фальсіфікацыі фактаў і вынікаў Другой сусветнай вайны. У такім аспекце нельга не згадаць расследаванне адносна месца масавага знішчэння мірнага насельніцтва часоў нямецкай акупацыі ў Чонкаўскім лесе ў рамках крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, распачатай Генеральнай пракуратурай Беларусі.

— Падпісаны Прэзідэнтам адпаведны закон — гэта ахова памяці соцень тысяч бязвінных ахвяр фашызму. У Год гістарычнай памяці ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі быў прадстаўлены ўнікальны выставачны праект «Бывайце, людзі...». Яго экспазіцыя дапамагае праліць святло на палітыку нямецкіх акупацыйных улад у гады Вялікай Айчыннай вайны па генацыдзе беларускага народа. Большасць экспанатаў выставачнага праекта — рэчы, знойдзеныя ў тым ліку падчас пошукавых работ вайскоўцамі спецыяльнага батальёна Міністэрства абароны Беларусі ў Чонкаўскім лесе. Расследаванне крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа працягваецца. Як і пошукавыя работы, якія дапамогуць раскрыць жахлівыя факты генацыду беларускага народа на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Усяго ў рэгіёне выяўлена 140 месцаў масавага расстрэлу і пахавання мірных грамадзян часоў Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер работа вядзецца ў Мазырскім раёне. У планах — Петрыкаўскі і Рэчыцкі раёны. Пошукавыя вахты прадоўжаць работу таксама ў месцах баёў і бітваў.

— Вядома, што ў кожным раёне рэгіёна сёлета праведзена вельмі плённая работа па арганізацыі выстаў архіўных дакументаў, кніжных і фотавыстаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне і Году гістарычнай памяці.

— І не толькі... У вобласці бягучы год вызначыўся адкрыццём значнай колькасці мемарыяльных і інфармацыйных дошак, патрыятычных білбордаў, сучасных муралаў. Варта адзначыць, што ў рэгіёне ў Год гістарычнай памяці быў арганізаваны шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных памятным і юбілейным датам населеных пунктаў, прадпрыемстваў і арганізацый Гомельшчыны. Былі адзначаны прысваенні імёнаў герояў Вялікай Айчыннай вайны, герояў Савецкага Саюза, выдатных землякоў навучальным установам, студэнцкім і піянерскім атрадам, вуліцам населеных пунктаў. Напрыклад, з мая гэтага года Гомельская гарадская паліклініка № 5 носіць імя Соф'і Голухавай — гераічнай міласэрнай сястры, узнагароджанай медалём Флорэнс Найтынгейл і ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені. У Год гістарычнай памяці адкрыты памятны знак на будынку чыгуначнага вакзала ў Калінкавічах у гонар 27 патрыётаў — чыгуначнікаў, якія ў гады вайны здабывалі бясцэнную разведвальную інфармацыю, удзельнічалі ў знішчэнні сіл і рэсурсаў гітлераўцаў. У гонар унікальнай спецаперацыі, якую правёў у Жлобінскім раёне атрад «Храбрацы», устаноўлена мемарыяльная дошка на станцыі Чырвоны Бераг. Знакавы праект Гомельшчыны — «Героі побач з намі», дзе грамадскім фарміраванням прысвойваюць імёны выбітных землякоў. На сёння імёны Герояў Савецкага Саюза, удзельнікаў Вялікай Айчыннай носіць больш за 430 піянерскіх дружын і звыш 470 студатрадаў. Каля брацкіх магіл, на мемарыялах моладзь арганізоўвае вахты памяці. Гераічным подзвігам продкаў прысвечаны праекты і ініцыятывы. Гістарычная памяць як найважнейшы кампанент унутранай самасвядомасці і культуры становіцца тэмай маладзёжных форумаў, навуковых канферэнцый, круглых сталоў і ўрокаў мужнасці.

Фота БелТА.

Знакавае месца памяці Гомельшчыны — мемарыяльны комплекс «Ала» ў Светлагорскім раёне.

— «Гэта яшчэ адзін добры знак у Год гістарычнай памяці: успомніць мінулае, няпростую гісторыю, зрабіць высновы, каб выбудоўваць сучаснае жыццё, планаваць будучыню, выхоўваць дзяцей і ўнукаў у міры і спакоі...» Здаецца, нельга больш дакладна, чым словамі Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Веніяміна прадставіць яшчэ адзін патрыятычны праект, які сёлета ажыццявіла Гомельшчына. Гаворка аб адкрыцці ў Гомелі капліцы ў імя святога князя Аляксандра Неўскага ў памяць аб воінах-вызваліцелях...

— Так, у Беларусі свята шануюць герояў, якія аддалі свае жыцці за мірнае неба, незалежнасць і суверэнітэт дзяржавы. Толькі ў нашым рэгіёне 1200 воінскіх пахаванняў. Імёны і подзвігі салдат, якія загінулі за свабоду і незалежнасць Радзімы, назаўжды захаваюцца ў нашых сэрцах. Ва ўсе часы аб спачыне загінулых за веру і Айчыну воінаў моліцца праваслаўная царква. Дзякуючы ініцыятыве Гомельскай епархіі цяпер кожны жыхар або госць Гомеля можа гэта зрабіць у капліцы ў памяць усіх воінаў-вызваліцеляў. Разам мы робім адну агульную справу — захоўваем гістарычную праўду, шануем светлую памяць загінулых за правую справу нашых дзядоў і прадзедаў. Нагадаю, што капліца ўзноўлена па праекце 1880-х гадоў Аляксандраўскай капліцы, якая знаходзілася на Рынкавай плошчы ў Гомелі насупраць Петрапаўлаўскага кафедральнага сабора. У капліцы сабрана 990 капсул з зямлёй з брацкіх магіл і воінскіх пахаванняў з усіх раёнаў Гомельскай вобласці, а таксама капсулы, напоўненыя зямлёй з месцаў, дзе ў ваеннае ліхалецце людзі перажылі пакуты і трагедыі, — з мемарыяльнага комплексу «Азарыцкі лагер смерці» ў Калінкавіцкім раёне і мемарыяла «Помнік дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны» ў Чырвоным Беразе Жлобінскага раёна. Упэўнены, што гомельская капліца ў імя святога князя Аляксандра Неўскага ў памяць аб воінах-вызваліцелях — своеасаблівае духоўнае пасланне аб подзвігу і славе нашых продкаў, і яшчэ многія стагоддзі людзі будуць свята захоўваць памяць аб тых, хто ў гады Вялікай Айчыннай вайны не пашкадаваў свайго жыцця дзеля будучых пакаленняў.

— Вядома, што Годам гістарычнай памяці зададзены значны патрыятычны імпульс, але важныя праекты ў гэтым кірунку працягнуцца.

— Так, ужо можна дакладна сказаць, што ў наступным годзе Гомельшчына рыхтуецца ажыццявіць рэканструкцыю мемарыяла на месцы лагера смерці «Азарычы» ў Калінкавіцкім раёне. Гэта месца памяці закранае адну з самых трагічных старонак нямецкай акупацыі Гомельшчыны, калі на страшныя пакуты было сагнана каля 50 тысяч чалавек мірнага грамадзянскага насельніцтва. Лагеры такога тыпу былі толькі ў Беларусі... Упершыню ў гады Другой сусветнай вайны людзей выкарыстоўвалі ў якасці біялагічнай зброі. Спадзяюся, што рэканструкцыя гэтага асаблівага для нашай краіны месца памяці стане чарговым сапраўды народным патрыятычным праектам.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Будзь у курсе!

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫ ГРАФІК ДЛЯ ВЫПУСКНІКОЎ

Міністэрства адукацыі зацвердзіла пералік прадметаў, па якіх будуць праводзіцца ў 2022/2023 навучальным годзе выніковыя іспыты, іх віды, формы і тэрміны правядзення.

Дзевяцікласнікі будуць здаваць выпускныя экзамены па беларускай і рускай мовах у форме пісьмовага пераказу, а таксама па матэматыцы (у форме пісьмовай кантрольнай работы) і гісторыі Беларусі (у вуснай форме). Асноўныя тэрміны правядзення іспытаў — з 1 да 9 чэрвеня, іншыя тэрміны — з 21 да 25 жніўня.

Адзінаццацікласнікам трэба будзе ўпершыню здаць два цэнтралізаваныя экзамены ў тэставай форме. Першы — абавязковы для ўсіх: па беларускай або рускай мове (па выбары навучэнца). Другі прадмет для цэнтралізаванага экзамену выпускнік выбірае з наступнага пераліку: фізіка, матэматыка, хімія, біялогія, замежная мова, гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя найноўшага часу, геаграфія, грамадазнаўства.

Асноўны тэрмін здачы экзамену па дзяржаўнай мове — 14 мая. Рэзервовы дзень — 23 мая. Выпускнікі, якія прапусцяць ЦЭ па ўважлівай прычыне ў асноўны і рэзервовы дзень, змогуць здаць яго ў рэзервовыя дні ЦТ. Апошняя магчымасць будзе ў іх 21 жніўня.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Цэнтралізаваны экзамен па выбары здаецца ўсімі адзінаццацікласнікамі 21 мая. Рэзервовы дзень — 25 мая. Выпускнікі, якія прапусцяць ЦЭ па ўважлівай прычыне ў асноўны і рэзервовы дзень, змогуць здаць яго ў рэзервовыя дні ЦТ. Апошняя магчымасць — 23 жніўня.

Пасля завяршэння навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі пры засваенні зместу адукацыйных праграм прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі для навучэнцаў і курсантаў праводзіцца выпускны экзамен па беларускай або рускай мове (па выбары) у выглядзе пераказу ў пісьмовай форме, а таксама па матэматыцы (пісьмовая кантрольная работа).

Акрамя таго, вызначаны формы выніковых іспытаў для вучняў гімназіі — каледжа мастацтваў, навучэнцаў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, парушэннямі зроку, цяжкасцямі ў навучанні, якія асвойваюць змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Героі вызначаны

На «Беларусь 1» адбыўся фінал першага сезона спартыўна-забаўляльнага праекта «Героі», і 25 снежня вызначылі яго пераможцаў. Трыумфатарамі працяглай барацьбы сталі ўдзельнікі каманды «Драйв»: Паліна Яшчукоўская, Максім Яцун і Глеб Дзямідаў. Усе яны з'яўляюцца навучэнцамі Спецыялізаванага ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС Рэспублікі Беларусь.

На працягу чатырох месяцаў праект «Героі» збіраў каля экранаў тэлегледачоў самых розных узростаў. Сучаснае прачытанне фармату культавай «Спартландыі» ў антуражы відэагульні — вынік сумеснай работы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, Белтэлерадыёкампаніі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Беларускай федэрацыі пажарна-выратавальнага спорту.

У ходзе спаборніцтваў навучэнцы секцый пажарна-выратавальнага спорту змагаліся за тытул «Герояў»: 16 каманд, у якія ўвайшлі 48 самых спрытных і вынослівых юнакоў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў краіны, сустракаліся на «лічбавай» арэне, каб скарыць стыхіі, што падуладныя толькі прафесіянальным выратавальнікам. А пасля, паспяхова пераадолеўшы складаныя выпрабаванні, па выніках серыі сустрэч на вяршыню турнірнай сеткі паднялася каманда гомельскага ліцэя МНС. Пераможцы шоу атрымалі ад арганізатараў гульнявыя планшэты ў падарунак, а галоўны прыз — найноўшая сілавая спортпляцоўка ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба — паводле рашэння самых ліцэістаў, дапоўніць падрыхтоўчую базу іх роднай навучальнай установы. Менавіта там жывуць і вучацца, загартоўваюць цела і дух будучыя героі — выратавальнікі, прафесіяналы падраздзялення МНС.

Варта адзначыць, што зараз творчая група праекта ўжо вядзе актыўную работу над другім сезонам, які абяцае быць яшчэ больш тэхналагічным і яркім. Вопыт, які атрымала каманда медыяхолдынга падчас работы над двума сезонамі музычнага «Фактару» і прэм'ернымі «Героямі», дазволіць ізноў здзівіць тэлеаўдыторыю арыгінальнымі рэжысёрска-пастановачнымі рашэннямі, захапляльнай аператарскай работай, а таксама высокай якасцю карцінкі і мностваm іншых эфірных сюрпрызаў. Сачыце за анонсамі і навінамі праекта, каб ізноў назіраць відовішчную барацьбу будучых майстроў выратавальнай справы.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 162

Сваю новую задачу даслаў нам Аляксандр Зелянко з Маладзечна *(гл. дыяграму)*.

Белыя: Крb3, Фе1, Лс3, Сf1, Ка3, Ка5 (6).
Чорныя: Крb6, Ка7, Ка8, па6 (4).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Эцюд Івана Бондара і Міхаіла Храмцэвіча атрымаў спецыяльны прыз на міжнародным юбілейным конкурсе «А. Селіванаву – 55».

Белыя: Крf3, Лс8, Се4, Кb7, пп. а6, с6, f7, h6 (8).
Чорныя: Кра7, Ла1, Лс1, Са3, пп. b2, g5 (6).

Выйгрыш.

1. Кс5! Лf1+! (1...С:с5? 2. Ла8+! Кр:а8 3. с7+ Кра7 4. с8Ф! g4+ 5. Кр:g4! b1Ф 6. Фа8+ або 1...Л:с5? 2. Ла8+! Кр:а8 3. f8Ф+) 2. Крg4! b1Ф (2...С:с5 3. Ла8+! Крb6 4. Лb8+! Крс7 5. Лb7+ Крd6 6. с7 Лf4+ 7. Кр:g5! Лf2 8. Л:b2! Се3+ 9. Крg6! Кр:с7 10. Л:f2! Л:а6+ 11. Крh7! С:h6 12. Лс2+) 3. Ла8+!! (3. Лс7+? Крb8! 4. С:b1 Кр:с7 =) Кр:а8 4. с7+ Ф:е4+ 5. К:е4 Лас1 6. h7! Сb2 (6...Лh1 7. Кс5! Кра7! 8. с8Ф! Лh4+ 9. Кр:g5! Л:с5+ 10. Ф:с5+! С:с5 11. Кр:h4 або 6...Лf4+ 7. Кр:g5! Л:f7 8. h8Ф+ Лf8 9. Фе5! Кра7 10. Фd4+! Кр:а6 11. Кd6! Лg8+ 12. Крf4! С:d6+ 13. Ф:d6+) 7. Кс3! (але не 7. Кf6!? Лg1+! 8. Крf3 Лgf1+ 9. Крe2 Лfe1+ 10. Крd2 Лed1+ =) Л:с3 8. h8Ф+ з выйгрышам.

* * *

Як мы ўжо паведамлялі, у Мінску прайшлі турніры першай лігі чэмпіянатаў Беларусі сярод мужчын і жанчын (праўда, некалькі шахматыстак выступалі ў мужчынскім турніры). У мужчын сярод 77 удзельнікаў былі два гросмайстры (але па розных прычынах яны не прайшлі ўсю дыстанцыю), адзін міжнародны майстар і чатыры майстры ФІДЭ. У выніку першае месца заняў міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі (8 балаў з 9), другое — майстар ФІДЭ Арцём Сіняўскі (7), а 3—7-е месцы падзялілі пяць шахматыстаў (па 6,5). З іх у вышэйшую лігу па дадатковых паказчыках прайшлі Сяргей Вашчылаў і Яраслаў Навумовіч, а не пашанцавала Аляксандру Алішэвічу, Канстанціну Куляшову і Арцёму Бяляўскаму. Пра жаночы турнір — у наступным выпуску.

Канстанцін Куляшоў — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. Кf3 Кf6 2. с4 е6 3. Кс3 d5 4. d4 с6 5. е3 Кbd7 6. Фс2 Сd6 7. b3 0-0 8. Се2 b6 9. 0-0 Сb7 10. Сb2 Лс8 11. е4 К:е4 12. К:е4 de 13. Ф:е4 Кf6 14. Фh4 с5 15. Лad1 Ке4 16. Ф:d8 Лf:d8 17. Кd2 К:d2 18. Л:d2 Се5 19. Лfd1 Сf4 20. Лс2 Се4 21. Сd3 С:d3 22. Л:d3 cd 23. g3 Се5 24. Лcd2 Лс6 25. f4 Сf6 26. Крf2 Лcd6 27. Крf3 е5 28. fe С:е5 29. Крe4 Ле6 30. Крf3 Лf6+ 31. Крg2 h5 32. Ле2 Ле6 33. a4 Сf6 34. Лed2 Сg5 35. Лс2 Лde8 36. Крh3 Сf6 37. Лcd2 Ле3 38. Крg2 Л:d3, 0:1.

Арцём Сіняўскі — Платон Клачкоў. 1. е4 d6 2. d4 Кf6 3. Кс3 g6 4. Се3 с6 5. Фd2 Фа5 6. h3 b5 7. Сd3 Кbd7 8. Кf3 Сb7 9. 0-0 b4 10. Ке2 с5 11. Кg3 Сg7 12. a3 Фс7 13. d5 h5 14. c4 bc3 15. bc c4 16. Сс2 h4 17. Ке2 Кс5 18. Кg5 Кfd7 19. Лab1 Са6 20. f4 Лс8 21. Кd4 Кb3 22. Фf2 К:d4 23. cd c3 24. f5 gf 25. Ф:f5 Сf6 26. Лf2 Лb8 27. Л:b8+ Ф:b8 28. К:f7 Кр:f7 29. Ф:d7 Сс8 30. Фс6 Лg8 31. Ф:с3 С:h3 32. Сf4 С:g2 33. Л:g2 Л:g2+ 34. Кр:g2 Фg8+ 35. Крf2 Фg4 36. Фf3 Фс8 37. Фh5+, 1:0.

* * *

Міхаіл Нікіценка на турніры ў Алматы падзяліў 1—2-е месцы (па дадатковых паказчыках ён другі), Андрэй Кавалёў паказаў такі ж вынік у Будапешце (па дадатковых паказчыках — першы). На чэмпіянаце Еўропы па хуткіх шахматах у Польшчы Сяргей Азараў падзяліў 2—11-е месцы (па дадатковых паказчыках — чацвёрты). У Ханты-Мансійску Дзяніс Лазавік быў пяты ў юнацкім турніры, а Ксенія Зелянцова — дзявятая ў дзявочым.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Фе6! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

ДЗЕ ЗЛАВІЦЬ НАВАГОДНІ НАСТРОЙ

Напярэдадні любімага многімі зімовага свята тэлеканалы медыяхолдынга ўжо атрымалі навагоднія аздабленне, у тэлестудыях з'явіліся ўпрыгожаныя ялінкі, а на «першай кнопцы» ў відэапаштоўках гучаць віншаванні ад вядучых беларускага тэлебачання. Як у апошні дзень адыходзячага года, так і ў першыя дні 2023-га тэлеаўдыторыю чакае спецыяльная праграма. Там самыя разнастайныя прапановы — традыцыйныя навагоднія «агеньчыкі», кінастужкі з навагодняй атмасферай, каб падарыць кожнаму адчуванне свята і добры настрой.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

З самай раніцы 31 снежня ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» ствараць чароўную атмасферу будуць навагоднія меладрамы «Цётачкі», «За пяць хвілін да студзеня», «Тры жаданні» і прэм'ера фільма «Сярэбраныя канькі». Не абыдзецца ў гэты дзень і без спецыяльных выпускаў любімых праграм «Добрай раніцы, Беларусь!» і «Здароўе». Дарэчы, не пакіне без сюрпрызу гледачоў Святлана Бароўская ў сваім аўтарскім выпуску «Добрай раніцы, Беларусь!» у першы дзень новага года.

А вечарам, адразу пасля «Панарамы», на галоўным тэлеканале пачнецца святочны канцэрт «Новы год на «Беларусь 1», у якім для аўдыторыі будуць спяваць удзельнікі першага і другога сезонаў самага папулярнага беларускага музычнага праекта «Фактар.by» у кампаніі вядомых артыстаў — ансамбля «Песняры», Анатоля Ярмоленкі, Аляксандра Саладухі, Вікторыі Алешкі і многіх іншых.

У 23.50 у эфіры ўсіх тэле- і радыёканалаў — Навагодні зварот Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі да беларускага народа. А першыя хвіліны 2023 года зноў зможам сустракаць пад акампанемент выступленняў любімых артыстаў на канцэрце «Новы год». Раніцай у 10.50 тэлегледачы ўбачаць «Галоўную ёлку краіны» — навагоднюю дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам кіраўніка дзяржавы.

Тэлеканал «Беларусь 2» прапануе правесці апошні дзень 2022 года з сям'ёй за праглядам анімацыйных фільмаў. Распачне мультмарафон кінастужка «Папялушка і зачараваны прынц», а працягне яго любімая многімі сага аб прыгодах трох волатаў і іх сяброў.

16.20 «Каханне і галубы». Нараджэнне легенды» (12+).
17.10, 18.20 «Сёння вечарам» (16+).
19.00 «Аб'ектыўНа» (16+).
20.00 Вячэрнія навіны.
21.15 «Усё зразумела» (16+) [СЦ].
21.25 Серыял «Мажор» (16+).
0.25 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 15.10, 16.50, 0.40 Дак. праект (16+).
10.40 «Акадэмія». Серыял (12+).
11.30, 13.45 «Жураў-2». Серыял (12+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Крэмень. Вызваленне». Серыял (16+).
23.10 «Без тармазоў» (16+).

МІР

5.00, 4.50 Мультфільмы (6+).
5.40 Маст. фільм «Прышэльцы» (12+).
7.25 Маст. фільм «Формула кахання» [СЦ] (12+).
9.00 Маст. фільм «Дзеці Дон Кіхота» [СЦ] (6+).
10.20 Маст. фільм «Танцуй, танцуй» (12+).
13.05 Серыял «Гардэмарыны, наперад!» [СЦ] (12+)
18.30 Навіны (бягучы радок).
18.55 Маст. фільм «Дзе знаходзіцца нофелэт?» [СЦ] (12+)

20.20 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе» [СЦ] (12+).
22.00 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» [СЦ] (12+).
0.35 Маст. фільм «Шукайце жанчыну» [СЦ] (12+).
3.05 «Гульня ў кіно» (12+).

РТР—Беларусь

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05, 7.05, 8.05, 9.05, 10.05 Серыял «Іншыя» (12+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 Фільм «Шафёр на адзін рэйс» (12+).
13.00 «Кропкі над і» (16+).
14.40 Фільм «Да цешчы на бліны» (12+).
17.40 «Песні ад усёй душы» (12+).
20.30 «Р. S.»
21.30, 23.15 Серыял «Скліфасоўскі» (16+).
23.40 Серыял «Нявеста камдыва» (12+).

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.15, 8.20, 13.00, 16.15, 19.30, 21.35, 22.35 Сёння. Галоўнае.
6.15 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Навукаманія» (6+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Ежа хоць куды (6+).
9.00, 10.20, 22.50 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата» (16+).
11.15 Серыял «Профіль забойцы» (16+).
13.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
16.25 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (12+).
19.45, 21.40 Серыял «Бім» (16+).

8 канал

7.00, 12.40, 17.45, 21.05, 0.55 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Кунг-фу Панда: рыцар дракона» (6+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Фэнтэзі «Залаты компас» (6+).
9.30 «Вядомыя беларусы».
9.50 Серыял «Перы Мейсан» (12+).
10.45 Баявік «Тор» (12+).
12.45 «Старая казка» (12+).
14.10 Мультпарад. «Дрэва жаданняў» (0+).
15.40 Серыял «Цудоўны век» (16+).
17.50 Серыял «Тата» (16+).
19.10 Серыял «Тэгеран» (16+).
20.45 «Вечарніца» (0+).
20.55 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.10 Драма «Пра каханне» (16+).
23.10 Драма «Французская сюіта» (18+).

ВТБ

6.00 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.40 «Лаві момант» (16+).
11.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
13.00 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
14.35, 3.05 «Уральскія пельмені» (16+).
14.45 Баявік «Фарсаж-7» (16+).
17.00 «Гатуем як шэф» (16+).
17.40 Серыял «Чорнае каханне» (16+).
22.20 Драма «Раство на дваіх» (16+).
0.00 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
1.35 Баявік «Атэль «Артэміда» (18+).
4.20 «6 кадраў» (16+).
5.10 Серыял «Ранеткі» (12+).

Культура

6.30 «Загадкавая планета», «Сабака ў ботах». М/ф.
7.10 «Паданне аб зямлі сібірскай». Маст. фільм.
8.50 Легенды сусветнага кіно.
9.20 «Невядомы». Дак. серыял [СЦ].
9.45 «Зямля Саннікава». Маст. фільм [СЦ].
11.20 «Паездка для душы. Хто ўпарты — таму на Валаам». Дак. фільм [СЦ].
12.05 «Песеннае ззянне Белага мора».
13.55, 2.40 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
14.10 «Апавяданні з рускай гісторыі».
15.30 «Гордасць і прадузятасць». Серыял.
17.15 «Скарбы Маскоўскага Крамля» [СЦ].
18.10 «Бацькі і дзеці». Дак. серыял [СЦ].
18.40 «Дзямідавы». Маст. фільм [СЦ].
21.10 Больш, чым каханне [СЦ].
21.50 «Ты і я». Маст. фільм [СЦ].
23.20 С. Рахманінаў. Канцэрт № 1 для фартэпіяна з аркестрам.
23.55 «Прыгонная актрыса». Маст. фільм [СЦ].
1.30 «Паездка для душы. Хто ўпарты — таму на Валаам». Дак. фільм [СЦ].
2.10 Год Гасподні [СЦ].

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+).
7.00 Маст. фільм «Яна вырашае рызыкнуць» (16+).
8.25, 9.40, 11.30, 15.40, 17.30, 19.15, 21.40, 23.30, 0.45, 2.40, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Музычная гавань Элеаноры Філінай» (16+).
13.20 Маст. фільм «Хаціна на нябёсах» (16+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.25 Маст. фільм «Фабрыка мрояў» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.00 Маст. фільм «Касабланка» (16+).

EuroSport 1

3.30, 8.00, 11.30, 18.00, 0.00 Скачкі на лыжах з трамплiна: КС. Турнэ чатырох трамплінаў, Бішафсхафен. Мужчыны (6+).
4.30, 9.00, 9.45, 12.30, 13.00, 17.35 Горныя лыжы. Кубак свету, Заграб. Жанчыны (6+).
5.00, 10.30 Ралі-рэйд: «Дакар», Саудаўская Аравія (6+).
6.00 Снукер: UK Championship (6+).
13.30 Біятлон. Кубак свету, Паклюка. Жанчыны (6+).
14.20, 21.45, 1.30, 2.45 Лыжныя гонкі: «Тур дэ Скі», Валь-ды-Ф'емэ. Мужчыны і жанчыны.
20.45, 21.15 Лыжнае двайборства. Кубак свету, Оцепя (6+).
23.00 Ралі-рэйд (6+).

Кінакамедыя

0.45 Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях (16+).
3.10 Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара (12+).
5.05 Астэрыкс і Абелікс: місія «Клеапатра» (12+).

7.05 Дзень выбараў (16+).
9.25 Дзень выбараў-2 (12+).
11.20 Родныя (12+).
13.00 Аднакласнікі (12+).
14.45 Аднакласнікі-2 (16+).
16.30 Доктар Дулітл (12+).
18.00 Доктар Дулітл-2 (12+).
19.30 Паездка ў Амерыку (18+).
21.30 Жывёла (12+).
22.55 Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25 «Паляванне на крылатага льва» (16+).
11.00, 0.50 «Паглядзім» (12+).
11.30, 1.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 18.25, 2.05 «Сляпая» (16+).
14.05, 19.25, 2.50 «Варажбітка» (16+).
15.00 «Відавочцы» (16+).
15.30 «Гучная справа» (16+).
16.25, 3.40 «Знакі лёсу» (16+).
17.25 «Якія вярнуліся» (16+).
20.25 «Прэстыж» (16+).
22.35 «Назаль». (16+).
0.10 «Як сустрэнеш, так і правядзеш!». Дак. фільм (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

TV 1000 ТБ1000

5.15 100 % воўк (6+).
7.00 Рэальная вавёрка (6+).
8.35 Рэальнае каханне (16+).
11.00 Меч караля Артура (12+).
13.15 Варкрафт (16+).
15.20 Прыгоды Цінціна: таямніца Аднарога (12+).
17.10 Абаронцы сноў (6+).
19.00 Цуда-жанчына (16+).
21.25 Міс Кангеніяльнасць (12+).
23.30 Міс Кангеніяльнасць-2: прыгожая і небяспечная (12+).
1.30 Валерыян і горад тысячы планет (16+).
3.40 Узыходжанне Юпітар (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Асцярожна, малпачкі! (6+)
6.15 Канікулы Баніфацыя (6+).
6.35 Кацяня па імені Гаў (6+).
7.30 Тайна трэцяй планеты (6+).
8.25 Падарожжа мурашкі (6+).
8.40 Сумленны развод (16+).
10.15 Сардэчна запрашаем у сям'ю (16+).
12.20 Пінокіа. Праўдзівая гісторыя (6+).
14.10 Іван Царэвіч і Шэры Воўк-4 (6+).
15.40 Бука. Мая любімая пачвара (6+).
17.30 Свята пад замком (16+).
19.00 Пальма (6+).
20.55 Экіпаж (6+).
23.20 Чарнобыль (12+).
1.35 Лёд (12+).
3.20 Лёд-2 (6+).

National Geographic

6.00, 6.05, 6.30, 6.55 Навуковыя глупствы (16+).
7.20, 8.10 Неверагодны доктар Пол (16+).
9.00, 9.45 Інстынкт выжывання (16+).
10.35, 11.25 Аўта-SOS (16+).
12.15 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
13.00 Дзікі тунец (16+).
13.45, 14.30, 19.20, 20.10, 0.15, 1.00 Расследаванне авіякатастроф (16+).
15.20, 16.10, 1.45, 2.35 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
16.55 Злавіць кантрабандыста (16+).
17.45 Марс (16+).
18.35, 19.00 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 21.50, 3.20 Паляўнічы на дыназаўраў (16+).
22.35, 23.25 У чаканні канца свету (16+).
4.10, 4.35 Зона будаўніцтва (16+).
5.15 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.30 Серыял «Разведчыцы» (16+).
7.15 Серыял «У чэрвені 41-га» (12+).
9.00 «Ясна аб міні-футболе».
9.30 Серыял «Учора скончылася вайна» (12+).
11.05 Серыял «Крапавы берэт» (12+).
12.40 Серыял «Афіцэры-2» (12+).
14.25 Маст. фільм «Дзень Перамогі» (16+).
15.45 Маст. фільм «Трэцяга не дадзена» (16+).
17.40 Серыял «Ваенная разведка. Паўночны фронт» (16+).
19.20 Серыял «Крэмень» (16+).
21.00 Інфармацыйны дайджэст «Час высокіх тэхналогій».
21.25 Серыял «Штрафбат» (16+).
23.00 Маст. фільм «Ч/Б» (16+).
0.35 Маст. фільм «Успомніць усё» (18+).
2.30 Маст. фільм «Блеф» (12+).
4.20 Маст. фільм «Бібліятэкар: у пошуках кап'я лёсу» (12+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 11.00. 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
8.50 Слова Архібіскупа Іосіфа Станеўскага на свята Богаяўлення Дзень Трох цароў.
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
10.00, 11.50, 12.15, 13.05 Драма «Галіна» (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
14.50, 20.45 «Фактар.BY».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.25 Драма «Каханне па памылцы» (12+).
17.05, 18.40, 19.20 Драма «Вучаніца Месінга» (16+).
20.00 Панарама.
23.50 Драма «Усе вырашаюць нябёсы» (12+).
01.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.35 «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
11.05 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).
12.35 Серыял «Той, хто чытае думкі. Менталіст» (16+).
14.20, 20.20 Драма «Вайна сем'яў» (16+).
15.15 «Вось такія людзі» (12+).
15.25 «Сямейныя гісторыі». Дак. драма (16+) [СЦ].
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
17.00 «На нажах» (16+).
17.50 «Гастратур» (16+).
18.35 «Я з вёскі» (12+).
19.05 «Дарагая, я забіў» (16+).
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 Фільм «Цуд» (12+).
23.15 «Тры першыя спатканні» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 15.20, 20.25, 22.30 «Навіны культуры».
8.15 «Размовы пра духоўнае». Аб'яўленне Пана (Тры Каралі) (катал.).
8.25, 22.45 «Аднойчы праз дваццаць гадоў». Маст. фільм (12+) [СЦ].
9.45, 17.05 «Апошні дзень» (12+).
10.20, 15.35 «Асенні марафон». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.10 «Сіла веры».
12.35 «Сваімі словамі».
13.10, 21.05 «Зімовы вечар у Гаграх». Маст. фільм (12+) [СЦ].
14.40 «Люблю і памятаю».
17.45, 20.00 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
18.00 Прамая трансляцыя Усяночнага няспання ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы.
20.15 «Асобы».
20.40 «Калыханка» (0+).
0.00 Калядная Боская літургія.

Беларусь 5

7.00 Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — ХК «Сочы».
8.50 Сняданак чэмпіёна.
9.20 Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Дынама-Мінск».
11.15 Хачу стаць...
11.45 Змешаныя адзінаборствы. Ліга Макслайн.
14.20 Хакей. КХЛ. «Металург» (Магнітагорск) — «Лакаматыў» (Яраслаўль).
16.50 Фактар сілы.
17.20 Авертайм.
17.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Металург» (Жлобін).
20.05 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
22.30 Планета спорту.
22.50 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. Ла Ліга. 16-ы тур. «Валенсія» — «Кадыс».

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Бачылі відэа?» (6+)
11.15, 13.15 Серыял «Цікаўная Варвара» (12+).
13.40, 23.10 Серыял «Свяцкія сувязі-2» (16+).
16.20 «Наталля Гвоздзікава. Народжаная кахаць, народжаная дараваць» (12+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.20 «Удача ў прыдачу! з «Еўраопт».
19.15 «Поле цудаў» (16+).
21.15 «Лаўроў. За гранню» (16+).
21.20 «Дзве зоркі. Бацькі і дзеці» (12+).
1.00 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 10.40, 13.45, 1.35 Дак. праект (16+).
14.05, 17.20 «Сэрца анёла». Серыял (12+).
16.50 «Рашэнне ёсць!»
18.05 «Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы» (16+).
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
20.40 «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
20.55, 23.10 «Галодныя гульні: Сойка-перасмешніца» (16+).
23.30 «Дастаць нажы» (16+).

МІР

5.00, 2.50 Мультфільмы (6+).
6.05 Маст. фільм «Формула кахання» [СЦ] (12+).
7.35, 18.55 Серыял «Балабон» [СЦ] (16+).

18.30 Навіны (бягучы радок).
23.30 Маст. фільм «Мой хлопец — анёл» (16+).
1.10 Маст. фільм «Буркун» (12+).

РТР—Беларусь

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05, 7.05, 8.05, 9.05, 10.05 Серыял «Іншыя» (12+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 Фільм «Рыфмуецца з любоўю» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «Класная тэма!» (12+)
17.40 «Песні ад усёй душы» (12+).
21.30, 23.15 Фільм «Цень кахання» (12+).
23.50 Нараджэнне Хрыстова. Трансляцыя ўрачыстага Каляднага богаслужэння.

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.15, 8.20, 13.00, 16.15, 19.30, 21.35, 22.35 Сёння. Галоўнае.
6.15 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Навукаманія» (6+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Ежа хоць куды (6+).
9.00, 10.20 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата» (16+).
11.15, 13.05 Серыял «Профіль забойцы» (16+).
14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
16.25 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (12+).
19.45, 21.40 Серыял «Бім» (16+).
22.50 Камедыя «Ой, мароз, мароз!» (16+)

8 канал

7.00, 13.35, 19.15, 21.10, 1.40 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Кунг-фу Панда: рыцар дракона» (6+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Камедыя «Мой сябар дзед Мароз» (12+).
9.00 Серыял «Перы Мейсан» (12+).
10.00 «Гром нябесны» (12+).
11.25 Фэнтэзі «Сярэбраная ноч» (12+).
13.40 «Старая казка». «Мія, мой Мія» (0+).
15.15 Мультпарад. «Ноч перад Калядамі» (6+).
16.40 Серыял «Цудоўны век» (16+).
17.40 Серыял «Строма» (16+).
19.20 Серыял «Тэгеран» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.15 Фэнтэзі «Тры тысячы гадоў» (18+).
23.00 «Любімае кіно».

ВТВ

6.00 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.40 «Лаві момант» (16+).
11.45, 23.15 «КВЗ. Панашаму» (16+).
13.00, 0.00 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
14.30 «Уральскія пельмені» (16+).
15.40 Трылер «Трайны фарсаж: такійскі дрыфт» (12+).
17.25 Баявік «Фарсаж-4» (12+).
19.10 Серыял «Чорнае каханне» (16+).
21.00 Фантастыка «Драпежнікі» (16+).
22.45 «Велабайкі» (16+).
1.30 Камедыя «Трэці лішні» (16+).
3.15 «Адна за ўсіх» (16+).
4.20 «6 кадраў» (16+).
5.10 Серыял «Ранеткі» (12+).

Культура

6.30 «Трое з Прастаквашына», «Канікулы ў Прастаквашыне», «Зіма ў Прастаквашыне». М/ф.
7.30 «Блізняты». Маст. фільм.
8.50 Легенды сусветнага кіно.
9.20 «Невядомы». Дак. серыял [СЦ].
9.45 «Яшчэ раз пра каханне». Маст. фільм [СЦ].
11.20, 1.05 «Зямля, погляд з космасу». Дак. фільм [СЦ].
12.10 Гала-канцэрт Фестывалю нацыянальных аркестраў Расіі.
13.45, 0.00 «Гардэмарыны, наперад!» Маст. фільм [СЦ].
14.55, 23.25 «Гісторыя рускіх шлюбаў». Дак. серыял [СЦ].
15.30, 21.40 «Гордасць і прадузятасць». Серыял.
17.15 «Скарбы Маскоўскага Крамля» [СЦ].
18.10 «Бацькі і дзеці». Дак. серыял [СЦ].
18.40 «Вакзал для двоіх». Маст. фільм [СЦ].
20.55 Іў Мантан спявае Прэвера. Фільм-канцэрт.
1.55 Шукальнікі.
2.40 «Дагані-вецер». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Яловая субмарына» (18+).
6.55, 8.45, 9.40, 11.30, 12.45, 14.40, 15.40, 17.30, 20.25, 21.40, 23.30, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.10 Маст. фільм «Фан-фан-цюльпан» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.00 Маст. фільм «Касабланка» (16+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Яна вырашае рызыкнуць» (16+).
0.00 Маст. фільм «Паўночны пацалунак» (16+).
1.40 «Музычная гавань Элеаноры Філінай» (18+).

EuroSport 1

3.30, 8.30, 15.15, 0.00 Скачкі на лыжах з трамплінаў: КС. Турнэ чатырох трамплінаў, Інсбрук. Мужчыны (6+).
4.30,19.30 Лыжныя гонкі: «Тур дэ Скі», Оберстдорф. Мужчыны (6+).
5.00, 10.30 Ралі-рэйд: «Дакар», Саудаўская Аравія (6+).
6.00 Снукер: фінал. О'Саліван (6+).
9.30, 12.30,13.05,22.30 Лыжныя гонкі: «Тур дэ Скі», Оберстдорф. Жанчыны (6+).
11.30 Дзюдо. Тэлечасопіс Judo Show (16+).
14.30, 18.40, 21.45, 2.45 Горныя лыжы. Кубак свету, Заграб. Жанчыны.
17.40,20.30,1.30,2.00 Горныя лыжы. Кубак свету, Гарміш-Партэнкірхен. Мужчыны.
23.00 Ралі-рэйд (6+).

Кінакамедыя

0.40 Дзень выбараў-2 (12+).
2.30 Паездка ў Амерыку (18+).
4.30 Зялёная кніга (16+).
6.45 Канікулы строгага рэжыму (12+).
8.50 Доктар Дулітл (12+).
10.15 Доктар Дулітл-2 (12+).
11.45 Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях (16+).
13.55 Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара (12+).
15.50 Астэрыкс і Абелікс: місія Клеапатра (12+).
17.50 Васабі (16+).
19.30 Родныя (12+).
21.10 Вельмі страшнае кіно (16+).
22.35 Вельмі страшнае кіно-2 (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.35, 18.05 «Адвакат Ардашаў» (16+).
11.10 «Перыскоп» (16+).
11.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 19.45, 2.50 «Сляпая» (16+).
14.10, 20.45, 3.40 «Варажбітка» (16+).
15.10, 17.10 «Паралельны свет» (16+).
16.05 «Відавочцы» (16+).
16.40 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
21.45 «Паўночнае ззянне» (16+).
23.30 «Невядомы» (16+).
0.20 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.15 «Дрэнны Санта» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.20 Кунг-фу Панда-3 (6+).
7.05 Міньёны (6+).
9.00 Зорны шлях (16+).
11.10 Стартрэк: адплата (12+).
13.25 Стартрэк: бясконцасць (16+).
15.35 Як прыручыць дракона (12+).
17.10 Як прыручыць дракона-2 (6+).
19.00 Грань будучыні (12+).
21.00 Вайна светаў Z (12+).
23.05 Элізіум: рай не на Зямлі (16+).
0.55 Вантажнае неба (16+).
3.05 Ілюзіяніст (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Шчаўкунок (6+).
5.55 Шайбу! Шайбу! (6+)
6.15 Віні-Пух (6+).
7.00 Трое з Прастаквашына (6+).
8.00 Чучала-Мяўчала (6+).
8.10 Казляня, якое лічыла да дзесяці (6+).
8.20 Рукавіца (6+).
8.35 Лёд (12+).
10.35 Лёд-2 (6+).
12.50 Садко (6+).
14.20 Конь Юлій і вялікія скачкі (6+).
15.40 Тры волаты і конь на троне (6+).
17.20 Сябры сяброў (16+).
19.00 Гогаль. Пачатак (18+).
20.55 Гогаль. Вій (16+).
22.35 Гогаль. Страшная помста (16+).

0.25 Гудбай, Амерыка (12+).
2.05 Баця (16+).
3.15 Родныя (12+).

National Geographic

6.00, 6.15, 6.35, 7.00 Навуковыя глупствы (16+).
7.25, 8.15 Неверагодны доктар Пол (16+).
9.05, 9.55 Інстынкт выжывання (16+).
10.45, 11.30 Аўта-SOS (16+).
12.20 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
13.05 Дзікі тунец (16+).
13.55, 14.40, 19.30, 20.10, 0.20, 1.05 Расследаванне авіякатастроф (16+).
15.30, 16.15, 1.50, 2.40 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
17.00 Ледзяная дарога (16+).
17.50 Марс (16+).
18.40, 19.05 Фабрыка ежы (16+).
21.00 Самыя цікавыя моманты гісторыі (16+).
21.50 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас (16+).
22.40, 23.30 У чаканні канца свету (16+).
3.25 Супердубаванні (16+).
4.15, 4.45 Зона будаўніцтва (16+).
5.10 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.45 Серыял «Чорныя ваўкі» (16+).
7.30 Маст. фільм «Цень ворага» (16+).
9.05 Серыял «Учора скончылася вайна» (12+).
10.30 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
12.20 Серыял «Афіцэры-2» (12+).
14.10 Серыял «Чорны сабака» (12+).
15.45 Серыял «Паляўнічыя на караваны» (16+).
17.20 Серыял «Ваенная разведка. Першы ўдар» (16+).
19.10 Серыял «Без права на выбар» (16+).
21.00 Дак. цыкл «Сувязісты».
21.25 Серыял «Брыгада» (16+).
23.20 Маст. фільм «Без кампрамісаў» (16+).
1.00 Серыял «У пошуках анёла» (16+).
2.45 Маст. фільм «Юрка — сын камандзіра» (6+).
4.00 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.25 Зона Х (16+).
9.10 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
9.55, 11.50, 12.15, 13.05 Драма «Тэарэма Піфагора» (16+).
10.55, 1.00 «Скажынемаўчы».
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
15.25, 22.20 Серыял «След» (16+).
17.05 Беларуская часінка (прамы эфір).
18.35, 19.20 Драма «Вучаніца Месінга» (16+).
20.50 «Фактар.BY».
21.00 Панарама.
21.45 Беларуская супержанчына.
21.55 Адзін дзень (12+).
0.05 Сфера інтарэсаў.
0.40 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
10.00, 16.55 Тэлебарометр.
10.05, 18.55 Серыял «Сляпая» (16+).
10.35, 19.25 «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
11.05, 17.00 Серыял «Цудоўная пяцёрка» (16+).
12.35, 20.45, 21.20 Серыял «Той, хто чытае думкі. Менталіст» (16+).
14.25, 19.55 Драма «Вайна сем'яў» (16+).
15.15 «Вось такія людзі» (12+).
15.25 «Сямейныя гісторыі». Дак. драма (16+) [СЦ].
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
18.25 «Я з вёскі» (12+).
21.10 Спартлато 6 з 49, КЕНА.
22.50 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
23.45 «Тры першыя спатканні» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.15, 20.30, 22.40 «Навіны культуры».
8.15, 18.35 «Здаецца дом з усімі нязручнасцямі». Маст. фільм (12+).
9.45, 17.55 «Легенды кіно» (12+).
10.25, 16.25 «Дзяўчына з гітарай». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.35 «Сваімі словамі».
13.10 Канцэрт «Госці фестывалю».
14.05, 21.05 «Лёгкае жыццё». Маст. фільм (12+).
15.35 «Люблю і памятаю» [СЦ].
20.00 «Жывая спадчына».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 Канцэрт «Дварцова-замкавая музыка Беларусі».
23.50 «Кампазітары Беларусі».

Беларусь 5

7.00 Між іншым.
7.20 Хакей. КХЛ. «Салават Юлаеў» (Уфа) — «Лакаматыў» (Яраслаўль).
9.15 Слэм-данк.
9.50, 19.20 Хакей. КХЛ. «Адмірал» (Уладзівасток) — «Дынама-Мінск».
12.20 Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. БК «Мінск» — «Зеніт» (Санкт-Пецярбург).
13.55 Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Поўначсталь» (Чарапавец).
15.50 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі.
16.50 Хакей. КХЛ. ЦСКА (Масква) — ХК «Сочы».
21.20 Спорт-цэнтр.
21.30 Фактар сілы.
22.00 Змешаныя адзінаборствы. Ліга Макслайн.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Бачылі відэа?» (6+)
11.15, 13.15 Серыял «Цікаўная Варвара» (12+).
13.40, 22.20 Серыял «Сваяцкія сувязі-2» (16+).
16.20 «Святлана Немаляева. «Мы стараліся берагчы адно аднаго» (12+).
17.20, 18.20, 18.55 «Сёння вечарам» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» (12+)
20.00 Вячэрнія навіны.
21.15 Серыял «Мажор» (16+).
0.15 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 10.40, 13.45, 0.40 Дак. праект (16+).
14.15, 16.50 «Сэрца анёла». Серыял (12+).
18.05 «Бабуля лёгкіх паводзін» (16+).
20.15, 23.05 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».
20.40 «Крэмень. Вызваленне». Серыял (16+).
23.10 «Перавозчык: спадчына» (16+).

МІР

5.00, 4.45 Мультфільмы (6+).
6.30 Маст. фільм «Зямля Саннікава» [СЦ] (6+).
8.10 Серыял «Сэрцы трох» [СЦ] (12+).
12.55 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе» [СЦ] (12+).
14.30 Маст. фільм «Дзе знаходзіцца нофелэт?» [СЦ] (12+)
15.55 Маст. фільм «Вакзал для дваіх» [СЦ] (12+).
18.30 Навіны (бягучы радок).
18.55 Маст. фільм «Па банку» [СЦ] (12+).
20.40 Маст. фільм «Па банку-2» [СЦ] (12+).
22.20 Маст. фільм «Бінга Бонга» (16+).
0.20 Маст. фільм «Туз» (16+).
1.50 Маст. фільм «Буркун» (12+).
3.30 «Гульня ў кіно» (12+).

РТР—Беларусь

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00 Беларусь. Навіны.
6.05, 7.05, 8.05, 9.05, 10.05 Серыял «Іншыя» (12+).
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 Фільм «Рыфмуецца з любоўю» (12+).
12.50 «Кропкі над і» (16+).
14.40 «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт (16+).
17.40 «Песні ад усёй душы» (12+).
21.30, 23.15 Серыял «Скліфасоўскі» (16+).
23.40 Серыял «Нявеста камдыва» (12+).

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.15, 8.20, 13.00, 16.15, 19.30, 21.35, 22.35 Сёння. Галоўнае.
6.15 «Здорава здаровым быць!» (6+)
6.55 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Навукаманія» (6+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Ежа хоць куды (6+).
9.00, 10.20, 22.50 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата» (16+).
11.15, 13.05 Серыял «Профіль забойцы» (16+).

14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).
16.25 Серыял «Пяць хвілін цішыні. Сімбірскія маразы» (12+).
19.45, 21.40 Серыял «Бім» (16+).

8 канал

7.00, 14.25, 19.50, 21.10, 0.45 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мульт-парад. «Кунг-фу Панда: рыцар дракона» (6+).
7.30, 14.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Камедыя «Грашовы поезд» (12+).
9.25 Серыял «Перы Мейсан» (12+).
10.15 «Героі коміксаў на экране». Дэтэктыў (12+).
12.50 «Любімае кіно» (16+).
14.35 Камедыя «Вечары на хутары каля Дзіканькі» (6+).
15.40 Мульт-парад (0+).
16.10 Серыял «Цудоўны век» (16+).
18.15 Серыял «Строма» (16+).
19.55 Серыял «Тэгеран» (16+).
20.45 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Салам алейкум, Беларусь!»
21.15 Спартыўная драма «Амерыканскі няўдачнік» (16+).
23.05 Драма «Неадэкватныя людзі» (16+).

ВТБ

6.00 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.40 «Лаві момант» (16+).
11.45, 23.35 «КВЗ. Панашаму» (16+).
13.00, 0.00 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
14.30 «Уральскія пельмені» (16+).
14.50 Баявік «Фарсаж-5» (12+).
17.00 Баявік «Фарсаж-6» (12+).
19.10 Серыял «Чорнае каханне» (16+).
21.00 Фантастыка «Рыдзік» (16+).
23.00 «Наш рамонт» (16+).
1.30 Камедыя «Трэці лішні-2» (18+).
3.25 «Адна за ўсіх» (16+).
4.20 «6 кадраў» (16+).
5.10 Серыял «Ранеткі» (12+).

Культура

6.30 «Малы і Карлсан». «Карлсан вярнуўся». М/ф.
7.20 «Цырк». Маст. фільм.
8.50 Легенды сусветнага кіно.
9.20 «Невядомы». Дак. серыял [СЦ].
9.45 «Утаймаванне свавольнай». Маст. фільм [СЦ].
11.15, 1.10 «Зямля, погляд з космасу». Дак. фільм [СЦ].
12.05 «Вялікія і маленькія».
13.40, 23.55 «Гардэмарыны, наперад!». Маст. фільм [СЦ].
14.55, 23.20 «Гісторыя рускіх шлюбаў». Дак. серыял [СЦ].
15.30, 21.40 «Гордасць і прадузятасць». Серыял.
17.15 «Скарбы Маскоўскага Крамля» [СЦ].
18.10 «Бацькі і дзеці». Дак. серыял [СЦ].
18.40 «Зямля Саннікава». Маст. фільм [СЦ].
20.10 «Канцэрт на біс!»
2.00 Шукальнікі.
2.45 «Раз каўбой, два каўбой...». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
6.45, 8.40, 9.40, 11.30, 14.25, 15.40, 17.30, 21.40, 23.30, 0.55, 2.45, 3.40, 5.30 Музычная настальгія (12+).
7.00 Маст. фільм «Касабланка» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.00, 17.00, 23.00, 5.00 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Яна вырашае рызыкнуць» (16+).
18.00 «Музычная гавань Элеаноры Філінай» (16+).
19.20 Маст. фільм «Хаціна на нябёсах» (16+).
0.00 «Яловая субмарына» (18+).
1.10 Маст. фільм «Фанфан-цюльпан» (16+).

EuroSport 1

3.30, 8.00, 11.30 Скачкі на лыжах з трампліна: КС. Турнэ чатырох трамплінаў, Інсбрук. Мужчыны (6+).
5.00, 10.30 Ралі-рэйд: «Дакар», Саудаўская Аравія (6+).
6.00 Снукер: Home Nations Series Northern Ireland Open (6+).
9.30, 15.30, 16.00, 16.45, 19.35, 1.00, 1.45 Горныя лыжы. Кубак свету, Заграб. Жанчыны (6+).
10.00,14.15, 14.45 Горныя лыжы. Кубак свету, Гарміш-Партэнкірхен. Мужчыны (6+).
13.00 Лыжныя гонкі: «Тур дэ Скі», Оберстдорф. Мужчыны (6+).
18.20, 22.00, 0.00 Скачкі на лыжах з трампліна: КС. Турнэ чатырох трамплінаў, Бішафсхафен. Мужчыны.
21.00, 2.30 Біятлон. Кубак свету, Паклюка. Жанчыны (6+).
23.00 Ралі-рэйд (6+).

Кінакамедыя

0.00 Вельмі страшнае кіно-3 (16+).
1.25 Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).
3.15 Чыноўнік (18+).
4.40 Сіньёр Рабінзон (16+).
6.40 Голы пісталет (16+).
8.10 Голы пісталет-2 1/2: пах страху (12+).
9.35 Голы пісталет-33 1/3: апошні выпад (16+).
11.00 Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
12.30 Васабі (16+).
14.10 Жывёла (12+).
15.35 Памяняцца месцамі (16+).
17.40 Калі свякроў — монстр... (16+)
19.30 Двое: я і мой цень (16+).
21.15 Горка! (16+).
23.05 Горка!-2 (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.25, 18.05 «Завушніцы з сапфірамі» (16+).
11.00 «Улегцы» (16+).
11.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 19.40, 2.50 «Сляпая» (16+).
14.10, 20.40, 3.40 «Варажбітка» (16+).
15.10, 17.10 «Паралельны свет» (16+).
16.05 «Відавочцы» (16+).
16.40 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
21.40 «Паўночнае ззянне» (16+).
23.25 «Невядомы» (16+).
0.20 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.10 «Прадаецца дача» (12+).
4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

ТБ1000

5.00 Як прыручыць дракона (12+).
6.35 Як прыручыць дракона-2 (6+).
8.15 Інтуіцыя (12+).
9.50 Элізіум: рай не на Зямлі (16+).
11.45 Вайна сусветаў Z (12+).
13.45 Грань будучыні (12+).
15.40 100 % воўк (6+).
17.20 Рэальная вавёрка (6+).
19.00 Варкрафт (16+).
21.10 Меч караля Артура (16+).
23.25 Назад у будучыню (12+).
1.20 Назад у будучыню II (12+).
3.05 Назад у будучыню III (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Дзед Мароз і лета (6+).
5.50 Дванаццаць месяцаў (6+).
6.45 Снежная каралева (6+).
7.55 Брыдкае качаня (6+).
8.20 Правадыр разнаскурых (16+).
10.00 Сябры сяброў (16+).
11.40 Роба (6+).
13.05 Іван Царэвіч і Шэры Воўк (6+).
14.40 Іван Царэвіч і Шэры Воўк-2 (6+).
15.50 Іван Царэвіч і Шэры Воўк-3 (6+).
17.15 Свінгеры (16+).
19.00 Сумленны развод (16+).
20.40 Давай развядзёмся! (12+)
22.20 Сардэчна запрашаем у сям'ю (16+).
0.25 Без межаў (12+).
2.00 Атэль «Бялград» (12+).
3.45 Халоп (12+).

National Geographic

6.00, 6.20, 6.45 Навуковыя глупствы (16+).
7.10, 8.00 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.50, 9.40 Інстынкт выжывання (16+).
10.30, 11.15 Аўта-SOS (16+).
12.05 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.50 Дзікі тунец (16+).
13.40, 14.25, 19.20, 20.10, 0.10, 0.55 Расследаванне авіякатастроф (16+).
15.15, 16.05, 1.45, 2.30 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
16.50 Суперзбудаванні (16+).
17.45 Марс (16+).
18.35, 19.00 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 21.45, 3.15 Злавіць кантрабандыста (16+).
22.30, 23.20 У чаканні канца свету (16+).
4.05, 4.40 Зона будаўніцтва (16+).
5.20 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.45 Серыял «Чорныя ваўкі» (16+).
7.25 Серыял «У чэрвені 41-га» (12+).
9.10 Серыял «Учора скончылася вайна» (12+).
10.40 Серыял «Крапавы берэт» (12+).
12.15 Серыял «Афіцэры-2» (12+).
14.00 Серыял «Чорны сабака» (12+).
15.30 Маст. фільм «Амерыкан бой» (16+).
17.25 Серыял «Ваенная разведка. Першы ўдар» (16+).
19.15 Серыял «Крэмень» (16+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 Серыял «Штрафбат» (16+).
0.00 Маст. фільм «(Не) ідэальны мужчына» (12+).
1.30 Серыял «У пошуках анёла» (16+).
3.20 Дак. серыял «Спадчына» (6+).
3.45 Серыял «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забароненая. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ДАІШНІК — ДРУГ ЧАЛАВЕКА

...У той і гаспадарцы, і акрузе Усевалад Міхайлавіч (ён жа проста Сева) быў на добрым рахунку. Ну яшчэ б: шчыры працаўнік, сем'янін, вопытны кіроўца, не гуляка, не п'яніца. Да таго ж — папросаць яго нешта зрабіць, некуды, напрыклад, падвезці, Сева, што называецца, ад слова — нікому не адмовіць... І за сваім «ГАЗонам», як за дзіцем, глядзіць, бо ў дарозе...

Чаго толькі там не бывае! За 30 гадоў работы Сева шмат дзе паездзіў: ледзь не ўсю Беларусь «прашнураваў», у Расіі пабываў, у Прыбалтыцы. А вось у Мінску — ні разу! У яго там нават радні не было, каб у госці з'ездзіць ды хоць уяўленне мець, што гэта за горад такі...

Але ж вось раптам камандзіроўка: збожжа трэба завезці на лікёра-гарэлачны завод.

Сева па звычцы: «Трэба дык трэба». Дастаў карту горада (якія навігатары ў 1990-м?), разам са знаёмым шафёрам «пралажылі» маршрут, і спакойна паруліў у сталіцу.

...Дзе ён памыліўся, як празяваў патрэбны паварот, сам пасля растлумачыць не мог, казаў, што чорт — няйначай — заблытаў: загнаў яго грузавік у паток легкавікоў, разам з іншымі панёс па галоўным сталічным праспекце, на якім, як ні дзіўна, чамусьці ніхто не затрымліваў.

І сам ён, не могучы ні спыніцца, ні збочыць, нёсся наперад — і кіламетр, і два, і тры, аж пакуль перад носам не ўбачыў... плошчу Перамогі, аж пакуль разам з іншымі не апынуўся ў кругавым руху вакол манумента... І ўжо там разгубіўся канчаткова, бо ўсунуцца, ушчаміцца між машын на іншай паласе, пакінуць «зачараванае кола», ну ніяк не мог! А таму...

Грунтоўна загружаны зернем калгасны «ГАЗон» «наразаў» ці не трынаццаты круг, калі яго ўрэшце спыніў работнік ДАІ, прычым настроены быў вельмі рашуча: збіраўся складаць пратакол, выпісваць штраф. Аднак убачыўшы парушальніка, усё зразумеў. Да таго ж Сева — у мокрай ад поту кашулі, з гэткім жа мокрым тварам ды чубам — не збіраўся маўчаць:

— Чалавека, мілы, памажы мне выехаць адсюль! — прасіў ён даішніка. — А то ж я суткі буду ў гэтай каруселі круціцца... Пакуль бензін не спалю...

На шчасце, міліцыянер таксама быў дзядзькам вясковым і таму не проста зразумеў чалавека, але і паспагадаў. Скамандаваў: «Едзь за мной» і, што называецца, суправадзіў аж да месца разгрузкі.

Расчулены Сева, апынуўшыся ўрэшце на тым самым злашчасным заводзе, прэзентаваў даішніку досыць важкую «пальцам піханую» каўбасу, якую адшкадаваў старшыня калгаса на той выпадак, калі на разгрузцы будзе чарга і спатрэбіцца хабар.

На гэтым мужчыны, задаволеныя сустрэчай, парукаліся ды разышліся.

...І пра інцыдэнт (недарэчны выпадак) на сталічнай плошчы ніхто б, магчыма, не ведаў, калі б Сева сам не «пахваліўся», не расказаў іншым.

Пасмяяліся з яго калегі, але ж па-добраму, бо ў дарозе чаго толькі не бывае: чаму і каму не ўзрадуешся, як Сева — ледзь не другу даішніку.

Алена Несцяронак,
г. Докшыцы.

ХТО ПЫТАЕ, ТОЙ НЕ БЛУДЗІЦЬ,

хто шукае — знойдзе!

Гэта было ў далёкія 60-я гады мінулага стагоддзя. Зімы тады стаялі суровыя, з нярэдкімі маразамі градусаў пад 30, з моцнымі завеямі. Здаралася, хаты ў нашай вёсцы Ластавічы замятала так, што на вуліцу не выбрацца: людзі — нідзе ж не дзенешся — вылазілі праз гарышчы.

Дык вось прыкладна ў такое надвор'е дзядзька Яфім — татаў пляменнік — запрасіў яго на так званую пагалоўшчыну, на забойства парсюка. Я, малая, напрасілася ў кампанію. А далей...

Тата запрог у сані Орліка і Харка, мама прыбрала мяне ў свой парадны кажушок і ў валёнкі. Мы паехалі з дому.

Раніца была сонечнай і марознай, снег весела скрыпеў пад палазамі.

Па дарозе тата вырашыў заехаць да радні ў вёску Кавалі — узяць з сабою сястру Кацю. Таму далей мы паехалі ўжо ўтраіх і да вёскі Замошша, да раз'езда, дзе жыў той дзядзька Яфім, дабраліся без прыгод. Тата на руках унёс мяне ў цёплую хату, паставіў на ногі. Я тут жа павалілася на падлогу, бо мамін кажушок на марозе настыў і даставаў да пят...

Але ж мужчынам было не да мяне: тата з дзядзькам Яфімам заспяшаліся на вуліцу, каб валіць, смаліць ды разбіраць таго парсюка. Гаспадыня з цёткай Кацяй падносілі ім розны посуд, ваду, потым — разбіралі кішкі, смажылі сала ды пячонку, зносілі на стол талеркі з салёнымі агуркамі, грыбамі, капустай, варанай бульбай... Пасярод гэтых закусак узвышалася пляшка гарэлкі, пачыналася вячэра — з тостамі, з рознымі размовамі.

А на вуліцы тым часам на ўсю моц гуляла мяцеліца. Гаспадыня прапаноўвала нам застацца нанач, але ж мы нарэшце (тату з-за стала было не выцягнуць!) сабраліся дамоў, прычым — не з пустымі рукамі. Дзядзька Яфім надзяліў нас свежыной, ладны шмат сала дастаўся і цёткі Каці.

...Дарогі ці хоць нейкага знаку ад нашых ранішніх санных слядоў на вуліцы, вядома ж, не было, але коні смела рвануліся з месца. Тата, седзячы напарадзе (я з ім побач), зрэдку падганяў іх пужкай і спяваў сваю любімую песню: «Ой, дзяўчына, шуміць гай, каго любіш забывай-забывай...»

Можа, пашкадаваўшы яе, тую дзяўчыну, я азірнулася назад, на незамужнюю цётку Кацю і заўважыла, што на возе яе... няма.

Тата, вядома ж, спалохаўся, мы развярнулі коней і паехалі назад — шукаць прапажу. Адмахалі (тата потым казаў) каля двух кіламетраў, калі нарэшце ўбачылі пры дарозе нейкую постаць. Тата кінуўся да яе, стаў распытваць цётку, ці ўсё ў яе цэлае, ці не пабіла што, зваліўшыся з воза?.. І ўжо потым, строга:

— Чаму не трымалася?!

— Дык жа сала, — бубніла Каця. — Мне ж трэ было яго трымаць!

— І што — утрымала?!

— Не-е... Упусціла, — ледзь не плакала цётка. — Яно недзе тут, у гурбе ляжыць.

Тата, помню, даводзіў ёй, што здароўе даражэй, што мерзнуць ды шукаць не будзем, што ён аддасць ёй свой кавалак, але Каця казала адно:

— Без сала я далей не паеду!

Такім чынам на ўзбочыне, бліжэй да месца падзення, пачаліся «раскопкі». Тата скінуў кажух, снег вакол сябе разграбаў рукамі і на каленях прасоўваўся наперад. Каця мерала гурбы нагамі, аж пакуль не пачула (ці не заўважыла?), што вецер «чытае» газету, у якую нашы свякі загортвалі сала...

Радасць не мела межаў! Мы паселі-ткі ў сані і паехалі далей. Праўда, тата болей не спяваў і ўвесь час пазіраў назад, ці на месцы Каця.

...Дадому мы прыехалі позна: мама, чакаючы нас, «усе вочы прагледзела» і «ўсе нервы спаліла».

Тата расказаў ёй, чаму затрымаліся. І гісторыя гэта магла б забыцца, калі б яны абое, нават праз гады, час ад часу не паўтаралі: «Ну што ты трасешся, як Каця над салам?», «Што ты трымаешся...», «Што шукаеш...»

А яно ж не грэх і трымацца, і шукаць, і трэсціся, бо добры ж прадукт!

І тая цётка была гаротніцай: ні сваёй сям'і, ні дома... Яна тады ў брата жыла. Можа, таму і не хацела вяртацца дамоў без гасцінца.

Валянціна Субач,
Глыбоцкі раён.

АБАЧЛІВЫ КІРОЎЦА,

альбо Дурныя жарты плачу варты

Таму, хто ў гэтым сумняваецца, мой расказ: летні, але ж, далібог, праўдзівы!

...Дастае апоўдні спёка:
Аж аўтобус перагрэўся!
І да вечара далёка...
Смага змучыла Алеся:
Раз за разам выцірае
На сабе «дарожкі» поту,
На гадзіннік пазірае,
Каб хутчэй спыніць работу:
«Дзе ж той
канцавы прыпынак?..
Людзі мігам не збяруцца —
Мецьму час на адпачынак,
Каб напіцца, разагнуцца...»
Побач, ведае, — калодзеж,
Са сцюдзёнаю вадзіцай.
Праўду кажуць у народзе:
Яе піць і не напіцца!
...Хлыкнуў некалькі глыточкаў,
Намачыў — халоднай — шыю:
— Эх, як добранька, браточкі!
Нібы зноўку малады я!
А пасля і ў радыятар
З паўвядра вады падліў,
Як той пан ці губернатар,
Вакол ПАЗа пахадзіў...
У бутэльку ад «Сталічнай»
(Іншай тары не было)
У дарогу ўзяў крынічнай...
А язык — што памяло:
— Усе паселі?
Дык паедзем!..
Можа,
хто напіцца хоча?
Я вось гэта прадугледзеў:
Ёсць да беленькай ахвочы?
Не? Дык сам...
Бутэльку ўгору
Падымаў Алесь няшпарка,
З палавіну так агараў,
Сказануў:
«Была б тут чарка!..»
Пасля гэтага —
паехаў,
«Шумяць вербы...» заспяваў.
Пасажырам —
не да смеху!
І як толькі ПАЗік стаў,
Сыпанулі ўсе, як з меха,
І бывай ніхто не даў!
Гумарыст, што вёз паветра,
Дзверы больш не адчыняў,
Аж пакуль... аўтаінспектар
На дарозе не дагнаў.
Трубку суне ў твар шафёру:
Са сваім: «Ану, дыхні!»
Той:
— Каб ты не ведаў гора!
За рулём?!
Крый бог!.. Ані!
...А нарэшце быў райцэнтр
Дзе, як трэ было чакаць,
Стрэў Алеся сам дырэктар:
Кузьку ўспомніў...
Яго маць...
Факт: чароўную вадзіцу
Сам Алесь, бывае, п'е
Але ж нават «пахмяліцца»
Пасажырам не дае.

Віктар Сабалеўскі,
г. Узда.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

***Ад яе ж** і, напэўна, яшчэ раз: завяршаецца год — завяршаецца конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю, надрукаваную ў 2022-м, «малюецца» адмысловая табліца, дзе будуць пералічаны ўсе — з прозвішчамі аўтараў, з датамі публікацый... І дзе потым, ужо ў новым годзе, з'явяцца балы...*

Нагадаем, што выставіць іх — свае ўласныя, вызначыць дзясятку тых, хто найбольш спадабаўся, і спісам даслаць у рэдакцыю — права кожнага з чытачоў. Дык чаму б не скарыстацца ім, не дапамагчы невялічкаму рэдакцыйнаму журы падвесці вынікі?

У пачатку 2023-га мы аб'явім іх і, дасць бог, узнагародзім пераможцаў.

А пакуль — шчыры дзякуй кожнаму, хто нам пісаў, кожнаму, хто хацеў гэта зрабіць, і, магчыма, хутка наважыцца, кожнаму, хто чытаў і будзе, бо...

Хай невялічкі, але ж запас гісторый у чаканні пятніцы яшчэ застаўся, значыць, паранейшаму сустракаемся? Як пісаў Віктар Гюго: «Мы нараджаемся з крыкам, паміраем са стогнам. Застаецца толькі жыць са смехам». Нягледзячы ні на што?

Неасабісты суб'ектыў

СЯРОД СНЯГОЎ ПРАЧНУЛАСЯ ВЯСНА

Некалькі аргументаў «за» дажджлівы Новы год

На нашым партале zviazda.by гэтай восенню быў устаноўлены свайго кшталту рэкорд — найбольшую колькасць праглядаў за найменш кароткі тэрмін знаходжання на сайце (літаральна за некалькі гадзін) сабраў фотасюжэт пастаяннага аўтара з Гомеля Андрэя Феакцістава. Мы з калегамі нават дыскутавалі аб прычыне гэткага феномену: ці то ўдала ў сацыяльныя сеткі матэрыял запосцілі, ці то сам аўтар, актыўны карыстальнік гэтых самых сетак, руку прыклаў, ці то загаловак у сюжэта «клікабельны» атрымаўся. Урэшце зрабілі выснову, што ўсё названае мела месца быць, а яшчэ памножылася на звычайную чалавечую цікаўнасць і нежаданне верыць у відавочнае.

Бо сюжэт, на першы погляд, як і назва да яго, — самыя што ні на ёсць на сёння звычайныя. «Вясна перад Новым годам на Гомельшчыне». І фота, больш падобныя на сакавіцкія: снягі, якіх менавіта на поўдні да гэтага накідала вельмі шмат, цяпер паплылі. Азёры на палях, вада ў слядах нейкага звера на пакуль яшчэ белым покрыве, сухія чаратыў разбухлай шэрай кашы, папяровы караблік, пушчаны дзіцячай рукой па вясёлай ручаіне, што імчыць па вясковай вуліцы; пушыстыя коцікі, якія за некалькі цёплых дзён паспелі вылузацца з пупышак на галінках вербалозаў... Глядзіш на гэтыя фота, пасля за акно, дзе па бляшаным карнізе надакучліва з раніцы барабаніць незразумелая субстанцыя — ці то снег, ці то дождж, і міжволі скрушна ўздыхаеш: вось табе сёлета і будзе Новы год...

Так жа хочацца пушыстага сняжку, лёгкага марозіку ў навагоднюю ноч, праўда? Каб усё было беленькае-прыгожае, каб зэяла не толькі святочная ілюмінацыя, але і само паветра трымцела празрыстымі іскрынкамі, і глядзелі з неба «ад марозу пахаладзеўшыя» зоркі. Тым больш усё было так блізка, так рэальна яшчэ некалькі дзён таму, калі быў і марозік, і пушысты снег, і вось гэта вось усё... Толькі праклятыатлантычны цыклон сапсаваў увесь настрой калі не ўсім, дык многім, а што ўжо многім планы парушыў, дык гэта дакладна. Сярод маіх знаёмых чалавек пяць адмянілі свае планы сустракаць Новы год у вёсцы ці на лецішчы, бо «што там рабіць — на чаўне плаваць?»

Але... Не ведаю, як вы, а я аптыміст па натуры. Прычым той самы невылечны, які, паводле старога анекдота, нюхае клапа і заяўляе, што той пахне каньяком. Дык вось, калі кіравацца гэтым прынцыпам, — зімовае свята ў такім вось пахмурна-дажджлівым антуражы — не так і дрэнна, і на тое ёсць аргументы. Па-першае, вельмі класна такім надвор'ем хадзіць у госці або сустракаць гасцей. Бо менавіта калі такая вось брыдкасць за акном, хочацца цёплай і светлай утульнасці, шчырага смеху, добрай даверлівай размовы. А яшчэ ў келіхах пускае бурбалкі шампанскае, у кутку нешта ціха спявае тэлевізар, пад ёлкай дрэмле пухнаты гадаванец... Прызнайцеся, употай вы марылі, каб здарыўся такі вось ціхі Новы год. Дык вось, у гэтай мары ёсць усе шанцы спраўдзіцца. Па-другое, нават калі адважыцца высунуцца ў навагоднюю ноч на вуліцу — верагоднасць змерзнуць ці што-небудзь адмарозіць (ведаю такія выпадкі, сама аднойчы прыплпла вуснамі да келіха з шампанскім) фактычна роўная нулю. Значыць, здароўю ў цёплую навагоднюю ноч будзе менш пагроз, а яго, здароўя, мы ж найперш сабе і ўсім блізкім людзям жадаем... Па-трэцяе (гэты варыянт для рамантыкаў), пад навагоднім дажджом можна без асаблівых намаганняў трапіць у казку. У якую? Ну, казкі ж розныя ёсць. «Дванаццаць месяцаў», напрыклад. Там гераіня па пралесі зімой хадзіла, памятаеце? Пралесак не абяцаю, а вось букет коцікаў прынамсі на Гомельшчыне побач з навагодняй ёлкай паставіць вельмі нават можна. Чым не вясна пад Новы год. І калі яшчэ такое будзе?..

Яшчэ мела што сказаць і па-чацвёртае, і па-пятае, ды тут навіны, якімі застракацелі ўсе інфармацыйныя рэсурсы, пра ракету, што заляцела з поўдня на нашу тэрыторыю, зблізі з думак, але затое падказалі самы галоўны аргумент, ад якога наўпрост залежаць усе астатнія. Няважна, якія ападкі будуць ісці ў навагоднюю ноч з неба. Галоўнае, каб яно, неба, і ў навагоднюю ноч, і заўсёды над намі, над нашай краінай было мірным. І гэта будзе найвялікшае шчасце і самы вялікі набытак.

Я вельмі шчыра веру, што так яно і будзе. І ўсім нам гэтага найперш жадаю.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

опубликованную в газете «Звязда» от 17 декабря 2021 года, с изменениями и дополнениями, опубликованными в газете «Звязда» от 18.02.2022 г., 26.05.2022 г., 09.07.2022 г., 30.07.2022 г., 24.08.2022 г., 08.09.2022 г., 10.11.2022 г., 03.12.2022 г. по объекту «Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин»

Внести следующие изменения и дополнения в текст проектной декларации:

1. Сведения в отношении объекта долевого строительства «- машино-место по проекту № А258 с кладовым помещением № К258 стоимостью в белорусских рублях, эквивалентной 25 100,00 долларам США», содержащиеся в перечне машино-мест с кладовыми помещениями, расположенными на -2 (минус втором) уровне гараж-стоянки, предлагаемых к приобретению по договору создания объектов долевого строительства, изложить в следующей редакции: «- машино-место по проекту № А258 с кладовым помещением № К258 стоимостью в белорусских рублях, эквивалентной 29 100,00 долларам США»

2. Раздел «Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства» дополнить абзацами следующего содержания:

«В соответствии с Положением о регулировании цены объекта долевого строительства от 29.07.2022 г., утв. приказом управляющего ООО «Гостевой дом» от 29.07.2022 г. № 3-ОД, снижение цены объекта долевого строительства возможно по соглашению сторон:

- при согласовании с потенциальным дольщиком графика платежей, в соответствии с которым предварительный платеж превышает 35 (тридцать пять) процентов от цены объекта долевого строительства, цена объекта долевого строительства подлежит снижению на 7 (семь) процентов от суммы, превышающей минимальный размер предварительного платежа (35 (тридцать пять) процентов от цены объекта долевого строительства).

- при согласовании с потенциальным дольщиком графика платежей, в соответствии с которым предварительный платеж составляет 90 (девяносто) и более процентов от цены объекта долевого строительства, цена объекта долевого строительства подлежит снижению на 7 (семь) процентов от суммы, составляющей 65 (шестьдесят пять) процентов от цены объекта долевого строительства;

- при заключении потенциальным дольщиком, а также при наличии заключенного дольщиком по состоянию на 03.01.2023 г. договора создания объекта долевого строительства на коммерческой основе в отношении жилого помещения (квартиры) и заключении в период с 03.01.2023 г. по 31.01.2023 г. договора создания объекта долевого строительства на коммерческой основе в отношении машино-места с кладовым помещением, расположенных на -2 (минус втором) уровне гараж-стоянки, по проекту номер:

А202 с кладовым помещением К202;
А203 с кладовым помещением К203;
А204 с кладовым помещением К204;
А214 с кладовым помещением К214;
А217 с кладовым помещением К217;
А218 с кладовым помещением К218;
А220 с кладовым помещением К220;
А224 с кладовым помещением К224;
А231 с кладовым помещением К231;
А232 с кладовым помещением К232;
А233 с кладовым помещением К233;
А234 с кладовым помещением К234;
А235 с кладовым помещением К235;
А236 с кладовым помещением К236;
А237 с кладовым помещением К237;
А238 с кладовым помещением К238;
